РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

26 ЛЮТАГА 2025 г. СЕРАДА № 39 (30427)



## АБ СПРАВАХ ДЗЯРЖАЎНЫХ І ДУХОЎНЫХ

**Учора ў Палацы Незалежнасці Прэзідэнт правёў дзве сустрэчы — з Наталляй Качанавай і мітрапалітам Веніямінам. Са Старшынёй Савета Рэспублікі кіраўнік дзяржавы абмяркоўваў фарміраванне новага складу ўрада і работу экспертнага савета. З прадстаяцелем Беларускай праваслаўнай царквы гаварылі пра важнасць стварэння духоўных цэнтраў і пра юбілеі знакавых святынь.**

(Працяг на 2-й стар.)

ПА ПАЛІЧКАХ

## КРЭДЫТ ПА НОВЫХ ПРАВІЛАХ

**Што варта ведаць, перад тым як пазычаць грошы?**

Як вядома, нядаўна Прэзідэнт падпісаў Закон «Аб спажывецкім крэдыце і спажывецкай мікрапазыцы». Закон рэгулюе адносіны ў сферы спажывецкага крэдытавання, распаўсюджвае сваё дзеянне на прадастаўленне крэдытаў на фінансаванне нерухомасці (з улікам асаблівасцяў) і не распаўсюджваецца на прадастаўленне крэдытаў індывідуальным прадпрымальнікам. Нормы гэтага закона ўступаюць у сілу праз дзевяць месяцаў пасля яго афіцыйнага апублікавання. Сумесна са спецыялістамі прэс-службы Нацбанка раскладзём па палічках усе важныя моманты дакумента, якія датычацца радавога спажыўца.

СТАР. 13




НІБЫТА І СВАЕ, А НІБЫТА І НЕ... 7



НЕ ІГНАРУЙЦЕ ПРЫШЧЭПКІ! 14



ПРЭМ'ЕРА РУБРЫКІ

## ЛЕТАПІС ПЕРАМОГІ НА СТАРОНКАХ «ЗВЯЗДЫ»




Што можа лепш расказаць пра нейкую знакавую гістарычную падзею, чым дакументальныя сведчанні? Толькі дакументальныя сведчанні, аформленыя ў жывыя журналісцкія публікацыі. Менавіта таму сваім чытачам аб падзеях васьмідзесяцігадовай даўнасці, калі Перамога была так блізка, але кожны крок да яе быў паліты крывёю савецкіх салдат, мы вырашылі расказаць праз публікацыі «Звязды». Нашы калегі-папярэднікі рабілі газету ў разбураным Мінску, не маючы нават і блізка тых тэхнічных магчымасцяў, якія маем мы сёння. Але пры гэтым паспявалі кожны дзень даць сваім чытачам поўную карціну таго, што адбывалася на франтах, і паказаць, як наша амаль знішчаная, але няскораная фашыстамі Беларусь вяртаецца да жыцця. Пачынаючы з сённяшняга нумара ў рубрыцы «Хроніка Вялікай Перамогі» дзень за днём разам са «Звяздой» далёкага 1945 года мы будзем ісці да светлай і святой даты 9 Мая. Тыя, хто пісаў і выдаваў гэтыя матэрыялы восемдзесят гадоў назад, не ведалі, калі яна, гэта дата, дакладна здарыцца. Але яны ад самага пачатку верылі, што яна абавязкова будзе ў нашай гісторыі.



СТАР. 11

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X
25039>
9 771990 763008

# «ВЕЛЬМІ ВАЖНА, КАБ ГЭТУ

## Прэзідэнт прыняў з дакладам Старшыню Савета

У кабінеце Аляксандра Лукашэнкі, у прыватнасці, абмяркоўваліся кадравыя пытанні. Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся ў Наталлі Качанавай, як ажыццяўляецца работа камісіі па фарміраванні новага складу ўрада. Акрамя таго, ішла размова аб дзейнасці экспертнага савета пры Савеце Рэспублікі.



Пачаў кіраўнік дзяржавы з развянчання ўкідаў і спекуляцый на тэму складу ўрада. «Бачу, ужо ў сродках масавай інфармацыі пачынаюць мусоліць: «Ах, урад! Хто будзе — не будзе», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Яны проста забыліся, журналісты, блогеры і іншыя, асабліва не нашы, што ўрад фарміруецца не пасля выбараў.

**Мы паступова фарміравалі ўрад да выбараў некалькі месяцаў, паўгода, а дзесьці год, прызначаючы міністраў і гэтак далей. У нас ужо амаль палова міністраў, членаў урада, працуе менш чым год. Гэта зноў прызначаныя людзі».**

Па словах беларускага лідара, усё, што ўваходзіць у кампетэнцыю Прэзідэнта, у тым ліку кіраўніцтва, вышэйшыя службовыя асобы і іншае, падлягае разгляду. Аляксандр Лукашэнка нагадаў пра сваю нядаўнюю просьбу — разгледзець новы склад урада камісійна, каб меркаванняў наконт прапанаваных кандыдатур было больш. Найперш размова ідзе аб кіраўніцтве ўрада, шэрагу міністраў, вышэйшых службовых асобах. Кіраўнік дзяржавы інфармаваны, што персаналіі новага складу ўжо неаднаразова абмяркоўваліся, ён пацікавіўся ў Наталлі Качанавай, да чаго прыйшлі.

Другое пытанне, на якое звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка, датычылася работы экспертнага савета пры Савеце Рэспублікі. «Каб мы, так сказаць, раздаючы паўнамоцтвы і перадаючы ад Прэзідэнта ўніз, не зладзілі мітусню ў органах улады і кіравання, — патлумачыў важнасць экспертнага савета Аляксандр Лукашэнка. — А мітусня можа быць (і гэта самае небяспечнае) і з боку законаў, якія мы прымаем. Таму вельмі важна, каб гэту сістэму мы не парушылі. І гэтаму павінен служыць перш за ўсё экспертны савет».

Кіраўнік дзяржавы ўдакладніў, як арганізавана работа экспертнага савета, і папрасіў Наталлю Качанаву не сыходзіць ад гэтых пытанняў, асабліва ўлічваючы яе ранейшы вопыт работы кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта.

**«Трэба, каб улада была ўладай, бо патрабаваць не будзе з каго, — паставіў задачу Аляксандр Лукашэнка. — Як мы будзем выканальніцкую дысцыпліну адладжваць у краіне, калі ў нас не будзе функцыянаваць нармальна вертыкаль улады, якую мы можам разбурыць самі, — законамі. Таму гэта вельмі важнае пытанне».**

# СТВАРЭННЕ РЭЛІГІЙНЫХ ЦЭНТРАЎ

## Падрабязнасці сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі з Мітрапалітам Мінскім і Заслаўскім,

Сёлета Беларуская праваслаўная царква святкуе значныя для ўсяго праваслаўнага свету даты. У маі адбудуцца ўрачыстыя мерапрыемствы з нагоды 555-годдзя здабыцця цудатворнага Жыровіцкага абраза Божай Маці і 505-годдзя Свята-Успенскага Жыровіцкага стаўрапігіяльнага мужчынскага манастыра. У чэрвені будзе адзначацца яшчэ адна знакавая для праваслаўя дата — 900-годдзе з дня заснавання Спаса-Ефрасіннеўскага стаўрапігіяльнага жаночага манастыра ў Полацку. На гэтыя важныя для хрысціян падзеі звернута ўвага і кіраўніка дзяржавы.

На пачатку размовы з Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі Аляксандр Лукашэнка адзначыў: вельмі добра, што сустрэча з уладыкам адбываецца пасля агульнага пасяджэння з прадстаўнікамі рэлігійных канфесій, якое адбылося 10 лютага. «Мне важна ведаць ваша меркаванне ў гэтым плане, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Асабліва ў плане стварэння пэўных цэнтраў нашых рэлігій. Я ведаю, што наша праваслаўная царква заўсёды рупліва да ўсяго ставілася, але і яны (прадстаўнікі іншых канфесій. — **«Зв.»**) таксама рупліва ставяцца да ўсяго. Таму ваша меркаванне для мяне тут вельмі важнае».

Другое пытанне, на якім Прэзідэнт засяродзіў увагу Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага, — добраўпарадкаванне Жыровічаў, што асабліва актуальна напярэдадні знакавых дат.

«Мы з вамі па вясне, калі прырода ўжо будзе пахнуць і квітнець, пабываем у Жыровічах, паглядзім, што там трэба яшчэ зрабіць, каб гэта было годна, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Пакольکі, як ні круці, праваслаўная царква — гэта 80 з лішнім працэнтаў вернікаў нашага насельніцтва, гэта асноўная рэлігія, канфесія, таму годна павінна быць у Жыровічах. Каб паглядзелі і іншыя, як трэба рабіць і што мы хочам зрабіць».



Прэзідэнт прапанаваў абмеркаваць і іншыя пытанні праваслаўя. «Можа быць, да ўлад ёсць нейкія пытанні, я гатовы іх абмеркаваць», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

**Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін праінфармаваў кіраўніка дзяржавы, чым сёння жыве і як развіваецца Беларуская праваслаўная царква, распавёў аб найбліжэйшых планах.**

«Дзесьці, можа, хацелася заручыцца вашай падтрымкай, пачуць вашу думку, — паведаміў Патрыяршы Экзарх. — У цэлым у развіццё сустрэчы, аб якой вы казалі, гэта вельмі важна. І перш за ўсё хацелася б падзякаваць вам за тое, што вы так клапоціцеся аб духоўных цэнтрах. У нас і Жыровічы, і Полацк — два такія цэнтры, якія прыцягваюць увагу ўсяго свету, не толькі беларусаў».

Уладыка расказаў, што летась завяршылася рэстаўрацыя і рэканструкцыя Жыровіцкага Свята-Успенскага манастырскага комплексу, а ў Полацку ў пачатку года адкрывалі пасля рэстаўрацыі старажытны храм, які ствараўся прападобнай Ефрасінняй Полацкай, — Спаса-Праабражэнскую царкву. «Гэта вельмі значная духоўная спадчына», — падкрэсліў Патрыяршы Экзарх. Дапамога ў рэстаўрацыі гэтых храмаў была аказана ў адпаведнасці з Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмай.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

# СІСТЭМУ НЕ ПАРУШЫЛІ»

## Рэспублікі

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы папрасіў Наталлю Качанаву праінфармаваць аб выніках яе візіту ў Азербайджан, які адбыўся на мінулым тыдні.

У сваю чаргу Старшыня Савета Рэспублікі нагадала, што сустрэча з беларускім лідарам праходзіць якраз у дату гадавіны адзінага дня галасавання. «Па сутнасці, у абноўленым складзе працуюць дэпутаты ўсіх узроўняў, — заўважыла яна. — І Савет Рэспублікі працуе ў новым складзе ў адпаведнасці з законамі, якія дзейнічаюць у нашай краіне, і зацверджаным рэгламентам, ніколькі не парушаючы яго і выконваючы задачы, пастаўленыя вамі. Гэта датычыцца і экспертнага савета, аб якім цяпер ішла размова».

Па словах спікера, з 2021 года праведзена больш як 140 пасяджэнняў экспертнага савета. «Мы разглядаем усе законапраекты і ўказы, якія кладуць на стол нам, а далей ідуць на подпіс да вас, — удакладніла Наталля Качанава. — Толькі 28,8 % з іх мы падтрымалі без заўваг. Астатнія былі накіраваны на дапрацоўку».



Пры гэтым Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла, што эксперты нікога не прымушаюць дапрацоўваць той ці іншы нарматыўны прававы акт. Яны выказваюць свае меркаванні, а далей урад або іншы кампетэнтны орган, што ўносіць на разгляд дакумент, паступае так, як лічыць патрэбным.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

### У тэму

## КАМПЕТЭНЦЫЯ, ВОПЫТ, ПРАФЕСІЯНАЛІЗМ, УМЕННЕ ПРАЦАВАЦЬ З ЛЮДЗЬМІ

**Гэтымі якасцямі, па меркаванні Наталлі КАЧАНАВАЙ, павінны валодаць члены ўрада новага складу**

Гаворачы аб рабоце камісіі па фарміраванні новага складу ўрада, у размове з журналістамі Старшыня Савета Рэспублікі праінфармавала, што сустрэчы на гэту тэму неаднаразова праходзілі з удзелам кіраўніцтва Адміністрацыі Прэзідэнта, Старшыні Палаты прадстаўнікоў, вышэйшых службовых асоб, давераных асоб Прэзідэнта ў ходзе электаральнай кампаніі.

«Абмяркоўваліся гэтыя пытанні і з нашымі старшынямі камісій, — удакладніла Наталля Качанава. — У Савеце Рэспублікі працуюць старшыні камісій, якія маюць сур'ёзны прафесійны вопыт, узровень падрыхтоўкі ва ўсіх кірунках. Гэта людзі, якія працавалі ва ўрадзе доўгі час, таму, вядома, яны выказалі свае прапановы. Мы гэтыя прапановы сфармулявалі, абагульнілі, прадставілі Аляксандру Рыгоравічу. Па некаторых кандыдатурах абмяркоўвалі правільнасць прыняцця таго ці іншага рашэння. Думаю, што ў найбліжэйшы час гэтыя рашэнні будуць прыняты нашым Прэзідэнтам».

**Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла, што падчас работы над канцэпцыяй кадравай палітыкі ў нашай краіне неаднаразова гучала думка аб неабходнасці ратацыі. «Людзі павінны прайсці ў сваім станаўленні пэўныя прафесійныя кропкі росту для таго, каб працаваць на пасадзе віцэ-прэм'ера або прэм'ер-міністра, міністра, — лічыць спікер. — Вядома, у іх павінна быць добрая падрыхтоўка. Яны павінны глыбока ведаць тую галіну, якой яны будуць займацца, бо гэта рэгулятар у той ці іншай сферы. А калі віцэ-прэм'ер — у некалькіх сферах. Таму тут павінны быць і кампетэнцыя, і вопыт, і прафесіяналізм, і ўменне працаваць з людзьмі, што немалаважна».**

Асобна Наталля Качанава спынілася на рабоце экспертнага савета пры Савеце Рэспублікі, які працуе па даручэнні Прэзідэнта. У яго ўваходзяць прадстаўнікі розных прафесій, спецыяльнасцяў, службовыя асобы. «Для таго каб даваць не толькі прававую, а ў цэлым ацэнку нарматыўнага прававога акта, які ў далейшым падпісвае Прэзідэнт нашай краіны, — канкрэтызавала спікер. — З таго часу як функцыянуе экспертны савет, мы разгледзелі найбольш важныя і актуальныя нарматыўныя прававыя акты для нашай краіны, далі ім прававую ацэнку, ацэнку ўздзеяння на соцыум, на наша грамадства. На экспертны савет запрашаем практыкаў, якія займаюцца потым рэалізацыяй таго ці іншага нарматыўнага прававога акта».

Па словах Старшыні Савета Рэспублікі, работа экспертнага савета з'яўляецца такім добрым фільтрам, які праходзіць дакумент, перш чым трапіць на стол кіраўніку дзяржавы. «Прэзідэнт даручыў працягнуць гэту работу, актывізаваць яе і працаваць у гэтым кірунку так, як мы працавалі раней, — адзначыла Наталля Качанава. — Ніколькі не сумняваюся, што ўсе задачы, якія паставіў Прэзідэнт перад намі ў плане работы з нарматыўнымі прававымі актамі, будуць выкананы ў поўным аб'ёме. Мы адказна падыходзім да гэтай работы, гэта вялікая дапамога нам у рабоце над законапраектамі».

# І СВЯТКАВАННЕ ЗНАЧНЫХ ДАТ

## Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі Веніямінам

### У тэму

## «ДУХОЎНЫЯ ЦЭНТРЫ, ЯКІЯ СЛУЖАЦЬ МЕСЦАМ ПРЫЦЯГНЕННЯ, ПАВІННЫ БЫЦЬ У КОЖНАЙ ВОБЛАСЦІ»

У размове з прадстаўнікамі СМІ Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін адзначыў, што пры абмеркаванні святкавання важных для праваслаўя дат у Жыровічах Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, каб у парадак быў прыведзены не толькі Жыровіцкі манастыр, але і яго наваколле. «Традыцыйна мы плануем святочнае богаслужэнне, і да гэтага свята павінна быць усё гатова, — падкрэсліў уладыка. — Акрамя таго, запланаваны асветніцкія мерапрыемствы, каб народ (і школьнікі, і студэнцтва, і старэйшае пакаленне) лепш ведаў аб нашых святынях, святынях беларускай зямлі».

Вялікая і насычаная праграма, па яго словах, падрыхтавана да святкавання 900-годдзя Спаса-Ефрасіннеўскага стаўрапігіяльнага жаночага манастыра ў Полацку. «Створаны спецыяльны аргкамітэт на рэспубліканскім узроўні, праходзяць адпаведныя падрыхтоўчыя мерапрыемствы, — канкрэтызаваў Мітрапаліт. — Самі ўрачыстасці пройдуць 4—5 чэрвеня. Чакаем візіт Найсвяцейшага Патрыярха Кірыла да гэтай даты і іншых гасцей. Дата вялікая, значная. Гэта адзін з самых старажытных манастыроў, які захаваўся на тэрыторыі Усходняй Еўропы».

У сувязі з гэтым Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі нагадаў, што нядаўна ў манастыры пасля рэстаўрацыі быў адкрыты старажытны Спаса-Праабражэнскі храм. Ён удакладніў, што туды ўжо можна зайсці наведвальнікам, паглядзець на старажытныя фрэскі, прасякнуцца тым светам духоўнасці, які стварыўся пад непасрэдным кіраўніцтвам прападобнай Ефрасінні Полацкай. І ў Жыровічах, і ў Полацку запланаваны адпаведныя хрэсныя ходы, накіраваныя да гэтых святых месцаў.

У розных кутках Беларусі ўзводзяцца і новыя храмы. Як звярнуў увагу Мітрапаліт Веніямін, будаўніцтва новых храмаў — гэта сведчанне таго, што жыццё развіваецца, набірае сілу і людзі ўжо не змяшчаюцца ў тых храмах, якія ў нас ёсць. «Сучасны чалавек мае патрэбу ў тым, каб была магчымасць наведаць храм у крокавай даступнасці, калі рытм жыцця дастаткова напружаны, — перакананы ён. — Храмы — гэта разам з тым і ўпрыгажэнне нашых гарадоў, вёсак, паколькі гэта асаблівая архітэктура, якая заклікае да таго, каб чалавек адхіляўся ад мітусні жыццёвай і, знаходзячыся ў храме, адчуваў, што неба на зямлі — гэта сусветная пахвала, як гавораць словы малітвы пры асвячэнні храмаў».

Кажучы аб стварэнні рэлігійных цэнтраў, аб чым на сустрэчы з прадстаўнікамі рэлігійных канфесій гаварыў кіраўнік дзяржавы, уладыка заўважыў, што такія духоўныя цэнтры, якія служаць месцам прыцягнення, павінны быць у кожнай вобласці. І яны ёсць. «Напрыклад, Гомельская вобласць — гэта старажытная зямля, дзе яшчэ 1020 гадоў таму была заснавана Тураўская епархія, другая пасля Полацкай, — удакладніў Мітрапаліт Веніямін. — Гэта і манастыр Святога праведнага Іаана Кармянскага, які з'яўляецца цэнтрам прыцягнення, і ў лепшыя часы туды прыязджалі паломнікі з Украіны, Расіі, Беларусі. Іх было настолькі шмат, што нават не ўмяшчаў храм. На Віцебшчыне мы кажам пра Полацкі манастыр, гродзенская зямля — гэта Жыровічы, Каложа».

Такое месца духоўнага прыцягнення, па словах уладыкі, павінна быць і ў сталіцы. «Гэта і кафедральны сабор, і храм Святых Апосталаў Пятра і Паўла, — прывёў прыклады ён. — Думаю, па статусе духоўным цэнтрам заклікаы стаць і Храм-помнік у гонар Усіх Святых, бо ў гэта месца прыязджаюць не толькі беларусы, тут увекавечана памяць аб загінулых за сваю зямлю, Айчыну».

НАПЯРЭДАДНІ

# «ПЛАНКУ ТРЭБА ЎЗНІМАЦЬ»

## Як ідзе падрыхтоўка Мінска да святкавання 80-годдзя Перамогі?

Прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА ўчора правёў пасяджэнне рэспубліканскага аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні святкавання 80-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.



— Крыху больш за два месяцы засталося да нашага вялікага юбілею — 80-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Падчас сённяшняга пасяджэння абмяркуем шэраг субстантыўных пытанняў, якія маюць непасрэднае дачыненне да правядзення ўрачыстых мерапрыемстваў 9 Мая, — адзначыў кіраўнік урада, адкрываючы пасяджэнне аргкамітэта.

Так, на парадку дня знаходзіліся канцэпцыя ваеннага парада, запрашэнне для ўдзелу ў ім вайскоўцаў іншых дзяржаў, лагатып свята, канцэпцыя правядзення святочных мерапрыемстваў, у тым ліку тэатралізаваны эпізод пасля завяршэння парада.

**— Жыхарамі Мінска, шматлікімі гасцямі адзначалася, што летась да афармлення горада падышлі нестандартна, выкарыстана шмат новых ідэй, у тым ліку па ўвекавечанні памяці герояў-вызваліцеляў, военачальнікаў, якія зрабілі значны ўнёсак у вызваленне Беларусі. Сёлета трэба планку ўтрымаць, але не паўтараючы тых рашэнняў, якія былі ўжытыя раней, — падкрэсліў прэм'ер-міністр.**

Прапановы па канцэпцыі тэматычнага афармлення сталіцы таксама былі разгледжаны на пасяджэнні аргкамітэта. Асобна ішла размова аб правядзенні выставы ў Мінскім міжнародным выставачным цэнтры, прымеркаванай да 80-годдзя Перамогі.

**— Прэзідэнтам краіны пастаўлена задача правесці выставу, прысвечаную ключавым падзеям і персаналіям гэтага перыяду, а таксама сучасным дасягненням беларускага абароннага комплексу, — нагадаў Раман Галоўчанка.**

На пасяджэнні разглядалася і пытанне ўзнагароджання гарадоў і іншых населеных пунктаў вымпелам «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны».

### «ЗАДУМА ПАРАДА МАШТАБНАЯ І ПРЫНЦЫПОВА НОВАЯ»

Пра гэта ў гутарцы з журналістамі расказаў **памочнік міністра абароны па ідэалагічнай рабоце ва Узброеных Сілах — начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Мінабароны генерал-маёр Леанід КАСІНСКІ.**

— Сёлета будзе прынцыпова новы падыход (усё ж такі сур'ёзная дата — 80 гадоў Перамогі, мы ўсе рыхтуемся да гэтага). І сярод мноства мерапрыемстваў, якія прадугледжаны рэспубліканскім планам, адно невялікае — гэта парад. Невялікае, але вельмі значнае, — падкрэсліў спікер.

У гэтым годзе парад будзе пабудаваны з дзвюх раўнацэнных частак:

— Адна частка гістарычная і другая — сучасная. Гістарычная частка будзе ўключаць у сябе праходжанне рознай рэтратэхнікі, у тым ліку якую прадастаўляюць рэканструктары: гэта будуць гістарычныя парадныя разлікі ў форме ваенных гадоў з узбраеннем ваенных гадоў. І, па сутнасці, гістарычная частка будзе пабудавана на асобных элементах парада Перамогі 1945 года ў Маскве.

Што датычыцца сучаснай часткі, Леанід Касінскі растлумачыў, што будзе прадстаўлена сучасная тэхніка:

— Гэта тыя тэхніка і ўзбраенне, якія стаяць на ўзбраенні Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь: пачынаючы з браніраванай тэхнікі, браніраваных машын і заканчваючы рознымі ўзорамі тэхнікі сувязі, радыёэлектроннай барацьбы — тое, што сёння мы атрымліваем на ўзбраенне і з чым мы сёння працуем.

Паводле яго слоў, плануецца ўдзел больш за 24 парадных разлікаў рознай тэхнікі.

— Увогуле, сама задума парада досыць маштабная і, як я ўжо сказаў, прынцыпова новая, — рэзюмаваў памочнік міністра абароны па ідэалагічнай рабоце ва Узброеных Сілах — начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Мінабароны.

ПАЗІЦЫЯ

# «ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА — ПЛАТФОРМА ДЛЯ ДЫЯЛОГУ І СУПРАЦОЎНІЦТВА, А НЕ КАНФРАНТАЦЫІ»

## Заявіў міністр замежных спраў Беларусі на сесіі Савета ААН

На Беларусь навесілі мільён ярлыкоў у галіне правоў чалавека. Гэта адзначыў міністр замежных спраў Беларусі Максім РЫЖАНКОЎ падчас выступлення ў Жэневе на сегменце высокага ўзроўню 58-й сесіі Савета ААН па правах чалавека (СПЧ).

«Пачну сваё выступленне вельмі нетыпова для прадстаўніка краіны, на якую навесілі мільён ярлыкоў у галіне правоў чалавека. Але я пастараюся вельмі зразумела растлумачыць усю абсурднасць любых абвінавачванняў адносна Беларусі», — падкрэсліў кіраўнік знешнепалітычнага ведамства.

Міністр выказаў меркаванне: «Дзяржава павінна станавіцца з кожным годам больш бяспечнай, моцнай і квітнеючай». «Скажыце, калі ў краіне грамадзяне жывуць пад мірным небам, адчуваюць сябе ў поўнай бяспецы, не баяцца, што іх застрэляць з аўтамата або саб'е грузавік, якім кіруе фанатык. Калі яны не баяцца за жыццё сваіх дзяцей, калі тыя ідуць у школу або гуляюць у двары. Калі яны маюць работу і дастатковую зарплату ў тым ліку, каб не эканоміць на прадуктах харчавання, на чыстай вадзе, ацяпленні жылля і электрычнасці. Калі ўжываюць якасныя натуральныя прадукты. Палітычна дасведчаныя і актыўныя. Дабаўце да гэтага бясплатныя дзіцячыя садкі, сярэднюю і вышэйшую адукацыю і ахову здароўя. Ці могуць быць у такой краіне фундаментальныя праблемы з правамі чалавека, як гэта ўсё разумее большасць з нас? Усё вышэйпералічанае ж і ёсць асноўныя правы чалавека, сярод якіх галоўнае — права на жыццё. Дык вось гэта ўсё — сучасная Беларусь, якую ведаем мы, беларусы; ведаюць тыя, хто хоць раз бываў у нас. Хто захоча наведаць Беларусь, убачаць гэта на ўласныя вочы. Вядома, у нас не ўсё гладка. Але ўсё, што я сказаў вышэй пра нас, — праўда. У якасці пацвярджэння: згодна з Міжнародным дакладам па выкананні Мэт устойлівага развіцця, Беларусь ужо датэрмінова дасягнула чатырох мэт: ліквідацыя галечы, чыстая вада і санітарыя, змяншэнне няроўнасці і захаванне экасістэм сушы».

Няма ўніверсальнай мадэлі рэалізацыі правоў чалавека, адзначыў Максім Рыжанкоў. Кіраўнік беларускага знешнепалітычнага ведамства заявіў: «Мы ўсе стаміліся ад таго, што краіны так званай развітой дэмакратыі робяць тое, што ім выгадна, і сёння самі грашаць у парушэнні правоў чалавека». Беларусь неаднаразова папярэджвала аб недапушчальнасці такіх «шараханняў» і вынаходніцтва сумнеўных праваабарончых канцэпцый. «Калі, нарэшце, на Захадзе зразумеюць, што правы чалавека — гэта платформа для дыялогу і супрацоўніцтва, а не канфрантацыі? Што няма ўніверсальнай мадэлі рэалізацыі правоў чалавека?» — агучыў пытанні міністр замежных спраў.

Наша краіна выступае за станоўчыя змяненні ў сферы правоў чалавека. «Мы гатовы падтрымліваць кіраўніцтва ААН у ініцыятывах, накіраваных на ўстойлівасць, на справядлівасць у міжнародных адносінах, — адзначыў кіраўнік беларускага знешнепалітычнага ведамства. — Але калі асобныя краіны не спыняць маніпуляваць праваабарончай тэматыкай, мы нічога не вырашым».

Максім Рыжанкоў падкрэсліў: «Беларусь заклікае правесці глабальную перазагрузку ў сферы правоў чалавека ў мэтах мінімізацыі канфліктнага патэнцыялу праваабарончай тэматыкі, дзе будзе ўлічана разнастайнасць палітычных сістэм, шляхоў развіцця і культурных традыцый, дзе будзе ўстаноўлена дакладная забарона на ўсякую іерархію ў правах чалавека і падвойныя стандарты».

Сапраўдным крызісам дэмакратыі з'яўляецца сама Еўропа, якая парушае ўсе базавыя чалавечыя каштоўнасці. «Для чаго сёння людзі ў свеце выходзяць на вуліцы? — задаў пытанне кіраўнік знешнепалітычнага ведамства. — Мы ж бачым гэта ў Беларусі па BBC, CNN, Euronews — калі сутыкаюцца з банальнымі жыццёвымі праблемамі. Так званы калектыўны Захад ахоплены акцыямі грамадзянскага непадпарадкавання, мы гэта ўсё бачым. Удзельнікі з большага не цікавяцца ні абаронай СМІ, ні нейкімі палітычнымі правамі. Мір і бяспека, працоўныя месцы і зарплата, пенсіі і сацыяльныя гарантыі — вось асноўныя трыгеры, якія выводзяць на вуліцы сёння мільёны людзей у Старым Свеце. Тыя мільёны, якія даўно расчараваліся ў здольнасці вырашыць свае праблемы праз выбары, мы бачым па колькасці тых, хто ўдзельнічае. Ды і ў прынцыпе, ці можна прызнаць узорнай сітуацыю са свабодамі і правамі СМІ ў Старым Свеце? Гэта ўжо разумеюць і ў Белым доме. Большасць з нас, а я гэта бачыў па выступленнях, якія былі да мяне, усведамляюць, што праваабарончая тэматыка развіваецца ў няправільным кірунку, усё больш набываючы супярэчлівы і раздзяляльны характар. Мы хутка ўсе забудзем цывілізацыйны шлях развіцця гэтых самых правоў».

«Свабодны свет» хутка мяняе свае прыярытэты, каб дагадзіць палітычнай кан'юнктуры. Кіраўнік знешнепалітычнага ведамства звярнуў увагу: «Свабодная Еўропа» закрывае ў сябе беларускія і расійскія СМІ. Закрыла практычна ўсё. Няўжо наша, як кажуць там, «прапаганда» з некалькіх каналаў можа нанесці шкоду маштабнай заходняй інфармацыйнай ідэалагічнай машыне? Ды кінь це! Нават гэтае права грамадзян — атрымліваць доступ да нікчэмнай альтэрнатыўнай думкі — знішчана».

Максім Рыжанкоў закрануў тэму перамяшчэння праз беларускую граніцу: «У ЕС забараняюць права або ўскосна права на перамяшчэнне праз граніцу не толькі сваіх грамадзян, але і грамадзян Беларусі і Расіі — праз нашу з Еўрасаюзам граніцу». Я маю на ўвазе не ўсіх у Еўрасаюзе, а вось Польшчу, Літву, Латвію. Мы, дарэчы, ведаем, чаго яны баяцца, — праўды. Праўды, якую прывязуць з сабой іх грамадзяне з паездкі ў нашы краіны. Парадокс! Але яшчэ 40 гадоў таму менавіта Захад уводзіў санкцыі супраць СССР за абмежаванне правоў савецкіх грамадзян на выезд за граніцу, каб яны, як мы тады казалі, не прывозілі «капіталістычную праўду».

«Пытанне бежанцаў заўсёды было «святым пытаннем» у правах чалавека. А сёння Times піша, што ЕС распрацоўвае план перагляду Канвенцыі ААН аб статусе бежанцаў з мэтай змяншэння іх правоў. Я ўжо не кажу пра кліматычны парадак дня і звязаныя з ім правы чалавека, — адзначыў Максім Рыжанкоў. — Вось як нам такім, як Захад лічыць, недэмакратычным, паспець за такімі «арэлямі», бо вы самі ў сябе не можаце разабрацца да канца?»

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# КЛОПАТ ПРА БУДУЧЫНЮ

## На Брэстчыне абмеркавалі рэалізацыю стратэгіі і дасягненні рэгіёнам Мэт устойлівага развіцця

**Нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця, намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Сяргей ХАМЕНКА з двухдзённым візітам наведаў Брэсцкую вобласць. Ён узяў удзел у рабоце міжнароднай дэлегацыі ў складзе пастаяннага каардынатара ААН у Беларусі Расула БАГІРАВА, пастаяннага прадстаўніка ПРААН у Беларусі ЛЮ Жэнфэй, кіраўніка Краінавага офіса СААЗ у Рэспубліцы Беларусь Сяргея ДЫЯРДЗІЦЫ. Гасцей суправаджаў таксама старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў, член Савета Рэспублікі Ігар БРЫЛЕВІЧ.**

Праграма двухдзённага візіту ўключала наведванне ўстаноў адукацыі, аховы здароўя і культуры, спартыўных комплексаў у Баранавічах, Кобрынскім і Камянецкім раёнах, Брэсце, Нацыянальнага парку «Белавежская пушча». У прыватнасці, прадстаўнікі міжнародных арганізацый пабывалі ў сярэдняй школе № 1 горада Баранавічаў імя С. І. Грыцаўца. Яе гонар — дзіцячы тэхнапарк. «Вельмі моцна ўражаны. Шчыра кажучы, упершыню бачу такую школу, такі падыход, такое стаўленне і да дзяцей, і ўвогуле да жыцця», — адзначыў пастаянны каардынатар ААН у Беларусі Расул Багіраў.

Ён звярнуў увагу на інтэграцыю ў навучальны працэс інклюзіўнасці. «Тут і дзеці з інваліднасцю, іх паўнацэннае ўключэнне ў жыццё вельмі важнае, як і творчасць, крэатыўнасць. Успамінаю сваю школу: вядома, такога не было. Магчымасці, якія ёсць цяпер, проста фантастыка. Гэта ўсё дазваляе ўстойліва развівацца», — сказаў Расул Багіраў, дадаўшы, што ўбачыў шмат добрых напрацовак.

Паводле слоў пастаяннага каардынатара ААН у Беларусі, ініцыятыва выезду ў рэгіёны ўзнікла падчас сустрэчы са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай. Першая ў спісе — Брэсцкая вобласць. «Патрэбна наведванне і іншых абласцей. Хочам больш даведацца, убачыць, спраектаваць, што можам зрабіць на ўзроўні не цэнтральным, а абласным, рэгіянальным, раённым і гэтак далей», — сказаў Расул Багіраў.

Падчас экскурсіі па тэрыторыі Белавежскай пушчы міжнародную дэлегацыю суправаджалі таксама генеральны дырэктар парку Уладзіслаў Цецяронак, старшыня Камянецкага раённага Савета дэпутатаў Аксана Высагроцкая, намеснік старшыні Камянецкага райвыканкама Аляксандр Міхальчык. Сяргей Хаменка звярнуў увагу кіраўніцтва Нацыянальнага парку, што па такім тытулаваным лесе добра б пускаць экскурсійныя аўтобусы не на традыцыйным паліве, а на электрычнасці. «Мы ўжо прапрацоўваем гэта пытанне. Думаю, у хуткім часе яно вырашыцца», — пагадзіўся з ім Уладзіслаў Цецяронак.

У Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А. С. Пушкіна адбылася цырымонія падпісання пагаднення аб уступленні Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна і Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта ў кансорцыум «Дабрабыт чалавека ў лічбавым асяроддзі «разумных» гарадоў». Кансорцыум створаны па ініцыятыве Нацыянальнага даследчага ўніверсітэта «Вышэйшая школа эканомікі». Цяпер ён аб'ядноўвае адзінаццаць беларускіх і расійскіх універсітэтаў, якія вывучаюць якасць жыцця людзей у «разумных» гарадах з улікам многіх фактараў.

У Беларусі назапашаны вялікі вопыт распрацоўкі стратэгіі ўстойлівага развіцця на мясцовым узроўні. Усе стратэгіі маюць розную ступень дэталізацыі выкладу, у тым ліку ў частцы асаблівасцяў развіцця тэрыторый. Напрыклад, на Брэстчыне была распрацавана абласная стратэгія развіцця да 2025 года, на раённым узроўні — устойлівая стратэгія развіцця Ганцавіцкага раёна да 2025 года, Бярозаўскага — да 2030 года, на ўзроўні сельскага Савета — устойлівая стратэгія Выганашчанскага сельскага Савета да 2025 года. У мінулым годзе практычна па-новаму выбудаваны працэс доўгатэрміновага планавання ўстойлівага рэгіянальнага развіцця.

У Брэсце Сяргей Хаменка таксама наведаў Брэсцкую дзіцячую абласную бальніцу і мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

НА СВАЕ ВОЧЫ

# ПЛОТ НА ГРАНІЦЫ І ШКОДА СУСВЕТНАЙ СПАДЧЫНЕ

## Прадстаўнікі міжнародных арганізацый азнаёміліся са станам спраў на трансгранічнай тэрыторыі

**Прадстаўнікі ААН, ПРААН, СААЗ падчас візіту ў Брэсцкую вобласць наведалі нацыянальны парк «Белавежская пушча». Адзін з прыпынкаў дэлегацыя зрабіла паблізу пабудаванага на граніцы польскага плота.**




Фота БелТА.

«У пункце пропуску «Перароў» быў упершыню ўведзены ў дзеянне бязвіз для замежных грамадзян, якія наведваюць Рэспубліку Беларусь. Тут замежнікі маглі наведаць беларускую частку Белавежскай пушчы ў спрошчаным парадку. Гэта было папулярна ў пешаходаў і веласіпедыстаў. Наведвалі з самых розных дзяржаў: не толькі найбліжэйшых з Еўрапейскага саюза, але і дастаткова аддаленых, такіх як Новая Зеландыя, Аўстралія, Эквадор, Канада і многіх іншых. Трэба адзначыць, што маршрут карыстаўся вялікай папулярнасцю. Прапускная здольнасць пункта — да 400 чалавек кожныя суткі. У сезон такая колькасць людзей і праходзіла. На жаль, у сакавіку 2020 года па ініцыятыве польскага боку ў сувязі з пандэміяй рух спыніўся і, нягледзячы на ўсе прапановы беларускага боку, да гэтага часу не аднаўляўся», — звярнуў увагу **афіцыйны прадстаўнік Брэсцкай пагранічнай групы Сяргей ДЗМІТРЫЕЎ.**

Ён дадаў, што на ўсім працягу беларуска-польскай граніцы цяпер функцыянуе толькі адзін пасажырскі пункт пропуску — «Брэст». «Пры гатоўнасці польскага боку мы былі б рады аднавіць рух і ў астатніх пунктах пропуску, што дало б магчымасць наведаць грамадзянам іншых дзяржаў нашу краіну і ўбачыць нашу гасціннасць. Менавіта гэту пазіцыю мы хацелі сёння данесці да прадстаўнікоў міжнародных арганізацый, падкрэсліць адкрытасць беларускага боку і гатоўнасць пайсці насустрач прапановам сумежнага боку», — сказаў ён.

Адзін з прадстаўнікоў міжнародных арганізацый заўважыў, што раней казалі аб узвядзенні СССР жалезнай заслоны. Польскі плот ён назваў рэальнай жалезнай заслонай. Рэліктаваму лесу Белавежскай пушчы і яе насельнікам ён нанёс адчувальныя страты.

«Змяненні па большай частцы адбыліся аднамоманта падчас будаўніцтва. Калі палякі будавалі дарогу і плот, яны высеклі ўчастак лесу, тым самым парушылі глебавае покрыва. Дарогай стварылі штучную дамбу, якая блакіравала рух паверхневых вод і, натуральна, выклікала парушэнні гідралагічнага рэжыму. У выніку чакаецца пагаршэнне генафонду папуляцыі дзікіх жывёл, паколькі плот стварае бар'ер і блакіруе іх міграцыю. Да таго ж пабудаваная дарога стала крыніцай унясення ў Белавежскую пушчу вялікай колькасці інвазійных відаў», — заўважыў **начальнік навуковага аддзела нацыянальнага парку «Белавежская пушча» Вячаслаў КРАЎЧУК.** Транспарт на колах, які прыязджаў на граніцу, стаў пераносчыкам насення «чужакоў». Сярод іх — сумнік канадскі, бальзамін драбнакветкавы і іншыя віды.

У польскім плоце зроблены брамкі для дзікіх жывёл. На ўсім працягу іх крыху больш за два дзясяткі. Аднак звяры да іх не прывязаны. Яны прытрымліваюцца раней пракладзеных сцежак, па якіх хадзілі гадамі.

«Ужо неадназова мы звярталіся ў Цэнтр сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, каб яны прыклалі намаганні, паўплывалі неяк на польскі бок, на польскі ўрад. У красавіку мінулага года ў Белавежскую пушчу прыбыла сумесная місія ЮНЕСКА/МСАП. Эксперты склалі справаздачу аб негатыўным уплыве гэтага плота і далі каля 15 рэкамендацый, з якіх амаль усе былі накіраваны польскаму боку. Былі выстаўлены розныя патрабаванні, якія трэба было рэалізаваць для таго, каб хаця б знізіць негатыўны ўплыў гэтага плота», — распавёў Вячаслаў Краўчук.

Рэкамендацыі экспертаў прыняты на сесіі Камітэта сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, якая адбылася летась у Нью-Дэлі. Беларусы чакаюць вынікаў, якія дзеянні прыме польскі бок. «Штогод у Цэнтр сусветнай спадчыны падаецца справаздача аб захаванасці аб'екта. З нашага боку справаздача прадстаўлена. Аб польскай справаздачы пакуль мы не ведаем. Не бачылі, што яны там напісалі», — падсумаваў начальнік навуковага аддзела нацпарка.

**Паводле БелТА.**

## УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ГИПРОСВЯЗЬ»

**Сообщаем о проведении годового общего собрания акционеров**

**Собрание состоится 28 марта 2025 года**
по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 24, конференц-зал.
Регистрация участников – с 9.00 до 9.40.
Начало проведения собрания: 10.00.

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Гипросвязь» за 2024 год.
2. Об утверждении годового отчета, годовой бухгалтерской отчетности ОАО «Гипросвязь» за 2024 год с учетом аудиторского заключения и заключения ревизионной комиссии.
3. О распределении чистой прибыли, оставшейся в распоряжении ОАО «Гипросвязь» за 2024 год, объявлении и выплате дивидендов по результатам 2024 года.
4. О направлении использования чистой прибыли ОАО «Гипросвязь» на 2025 год.
5. Об избрании членов наблюдательного совета ОАО «Гипросвязь».
6. Об избрании членов ревизионной комиссии ОАО «Гипросвязь».
7. Об определении размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Время и место ознакомления акционеров со следующей информацией:

о деятельности ОАО «Гипросвязь» за отчетный год – с 7 по 27 марта 2025 года по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 24, каб. 221 в рабочие дни (понедельник – пятница) с 14.00 до 16.00;

с материалами по вопросам повестки дня собрания акционеров – с 7 по 27 марта 2025 года по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 24, каб. 221 в рабочие дни (понедельник – пятница) с 14.00 до 16.00.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:
акционеру Общества – документ, удостоверяющий личность;

представителю акционера – документ, удостоверяющий личность и оригинал доверенности, который должен быть передан лицу, определенному директором ОАО «Гипросвязь» для выполнения этих функций.

Список акционеров ОАО «Гипросвязь», имеющих право на участие в общем собрании акционеров, будет составлен по состоянию на 27 февраля 2025 года.

С протоколом годового общего собрания акционеров ОАО «Гипросвязь» можно будет ознакомиться в каб. 221 в рабочие дни (понедельник – пятница) с 14.00 до 16.00.

**Наблюдательный совет.**

УНП 100230534

Центр Промышленной Оценки

• **Организация аукционов**
• **Оценка всех видов имущества**

### Извещение о проведении электронных торгов

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. Сайт в интернете: www.cpo.by |
| **Продавец** | ОАО «Сбер Банк», 220030, г. Минск, пр-т Независимости, 32А-1 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |

| **Предмет электронных торгов: имущество, реализуемое одним лотом, по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Пушкина, 172** | **Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.** |
|---|---|
| **1. Здание банка** (здание нежилое) общей площадью 2124,2 кв. м, инвентарный номер 710/С-52251. Составные части и принадлежности: подвал.<br>**2. Помещение гаражей** (помещение гаражей), общей площадью 41,6 кв. м, инвентарный номер 710/D-54201.<br>**3. Складское помещение** (складское помещение), общей площадью 41,3 кв. м, инвентарный номер 710/D-54202 | 1 212 540,00 |

**Дополнительная информация по лоту:** при приобретении предмета аукциона, победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договор купли-продажи имущества, относящегося к предмету аукциона на сумму **89 437,70 бел. руб. с НДС 20 %**. Состав имущества и цены размещены на сайте организатора аукциона www.cpo.by и www.ipmtorgi.by

**Сведения о земельном участке с кадастровым номером 741000000006001659:** предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания Первомайского отделения ОАО «Белпромстройбанк» в г. Бобруйске общей площадью 0,2969 га

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ» г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»**

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** рабочих дней после электронных торгов.
**Условия оплаты предмета электронных торгов:** не более 30 дней со дня заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by.** Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **0,7 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 21.01.2025 г.

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | Начало торгов: в 10.00 **11.03.2025 г.** Окончание торгов: в 12.00 04.03.2025 г. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 10.03.2025 г. до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by |
| **Контактные данные** | Тел.: +375 17-310-36-37; +375 (44) 704-92-06 E-mail: auction@cpo.by |

# УСЕ ЗАДАЧЫ ВЫКАНАНЫ

**Арганізацыі Мінэнерга ў поўным аб'ёме забяспечылі эканоміку краіны і насельніцтва электрычнай, цеплавой энергіяй, газападобным і цвёрдым палівам**

Пра гэта паведаміў міністр энергетыкі Аляксей Кушнарэнка падчас нядаўняй калегіі ведамства, на якой былі разгледжаны вынікі работы галіны ў 2024 годзе.



Дзякуючы дзейнасці ўласных энергакрыніц і флагмана энергасістэмы — Беларускай атамнай электрастанцыі ў краіне назіраецца ўстойлівы рост электраспажывання. У мінулым годзе гэты паказчык дасягнуў рэкорднага значэння — 43,2 млрд кВт.г электраэнергіі, гэта на 5 % больш за ўзровень 2023 года, паведамілі ў прэс-службе ведамства.

— Гэта дае нам дадатковыя магчымасці развіваць электратранспарт, электрыфікацыю жыллёвага фонду, энергаёмістыя вытворчасці. Акрамя таго, для надзейнай работы беларускай энергасістэмы ў мінулым годзе ўведзены ў эксплуатацыю пікава-рэзервовыя крыніцы магутнасцю 800 МВт, — адзначыў профільны міністр.

У прыватнасці, колькасць электрамабіляў на дарогах краіны перавысіла 23 тысячы, спажыванне электраэнергіі зараднымі станцыямі вырасла ў два разы і дасягнула 39,6 млн кВт.г.

Таксама на 34 % узрос аб'ём выкарыстання электраэнергіі насельніцтвам для мэт абагравання, і па выніку 2024 года ён склаў 880 млн кВт.г. А за пяць гадоў ён вырас больш чым у 100 разоў.

Акрамя гэтага, Аляксей Кушнарэнка расказаў аб рабоце па электрыфікацыі:

— У сістэме Мінэнерга праводзіцца маштабная работа па мадэрнізацыі электрасеткавага комплексу, каб у поўнай меры задаволіць попыт грамадзян на выкарыстанне айчыннай электраэнергіі для ацяплення, гарачага водазабеспячэння і гатавання ежы. Толькі летась мы выдалі 31 тысячу тэхнічных умоў для падключэння домаўладанняў на гэтыя мэты, задаволіўшы тым самым попыт на 94 %. Пры гэтым пабудавана і рэканструявана каля 3 тысяч ліній электраперадачы.

Кіраўнік Мінэнерга акцэнтаваў увагу і на рабоце праектнага і будаўнічага блока, які закрывае ўнутраныя патрэбы краіны, а таксама працуе за яе межамі:

— Так, наш холдынг «Белгазбуд» актыўна ўдзельнічае ў газіфікацыі расійскіх рэгіёнаў і за 2024 год ужо зарабіў каля 2,5 мільёна долараў, пабудаваўшы больш за 70 км газавых сетак.

# СФЕРА ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ

**БелГПП плануе арганізаваць чатыры дзелавыя візіты беларускіх кампаній у Турцыю сёлета**

Старшыня БелГПП Міхаіл МЯТЛІКАЎ правёў сустрэчу з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Турцыі ў Беларусі Гючлю Джэмам Ышыкам, паведамілі ў прэс-службе гандлёва-прамысловай палаты.




Тут растлумачылі, што ў 2024 годзе па лініі БелГПП адбыліся 24 дзелавыя мерапрыемствы, уключаючы пасяджэнне беларуска-турэцкага савета дзелавога супрацоўніцтва 28 лістапада 2024 года.

— Мы таксама высока цэнім добрыя адносіны паміж палатай і Пасольствам Турцыі ў Мінску, — падкрэсліў Міхаіл Мятлікаў.

Пераходзячы да пытання двухбаковага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, старшыня БелГПП адзначыў, што Турцыя ўжо чацвёрты год запар уваходзіць у лік вядучых гандлёвых партнёраў Беларусі:

— Як паказвае беларуская статыстыка, мы паспяхова пастаўляем на турэцкі рынак абсталяванне, прадукцыю дрэваапрацоўкі, пластмасу і ўгнаенні. У сваю чаргу беларусы з задавальненнем купляюць турэцкую садавіну і гародніну. І, вядома, турэцкая прамысловая прадукцыя (абсталяванне, трыкатажныя палотны, хімічныя ніткі і валокны) таксама запатрабавана ў Беларусі.

На яго думку, найважнейшым складнікам для далейшага нарошчвання ўзаемнага гандлю з'яўляецца эфектыўная лагістыка.

Што датычыцца планаў на 2025 год, Міхаіл Мятлікаў пацвердзіў нацэленасць БелГПП на далейшае пашырэнне дзелавога супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Турцыяй:

— Па лініі БелГПП плануецца чатыры дзелавыя візіты ў Турцыю на гэты год, а таксама ўдзел беларускіх дэлегацый у дзвюх выставах у гэтай краіне — выставе пражы і валакна YARNFAIR і выставе прадуктаў харчавання, напояў і тэхналогій вытворчасці F Istanbul.

Асобна кіраўнік БелГПП адзначыў, што для турэцкіх кампаній удзел у выставе «ІНАПРАМ», якая пройдзе ў Мінску 29 верасня — 1 кастрычніка, стане выдатнай магчымасцю наладзіць дзелавыя кантакты з расійскімі, беларускімі кампаніямі і кампаніямі з краін СНД.

Ён таксама дадаў, што выстава будзе суправаджацца маштабнай дзелавой праграмай. У рамках новага фармату ўзаемадзеяння палаты з членамі БелГПП запланаваны сустрэчы беларускага бізнесу з акрэдытаванымі ў Беларусі пасламі.

— Напрыклад, у першым квартале мы будзем арганізоўваць сустрэчу з пасламі краін Лацінскай Амерыкі, у другім — краін Афрыкі, затым Азіі і СНД. Але, напрыклад, два тыдні таму з улікам вялікай цікавасці бізнесу мы правялі — і вельмі паспяхова — сустрэчу беларускіх прадпрыемстваў з пaслом Сербіі, — расказаў ён.

**У тэму**

## УНІКАЛЬНАЯ ПЛАТФОРМА ДЛЯ АБМЕНУ ВОПЫТАМ

**Выязную выставу ІНАПРАМ плануецца правесці ў Мінску ў верасні — кастрычніку**

«ІНАПРАМ. Беларусь» — гэта міжнародная прамысловая выстава, якая аб'ядноўвае прадстаўнікоў розных галін прамысловасці, інавацыйных кампаній, інвестараў і дзяржаўных структур, нагадалі ў прэс-службе Беларускай гандлёва-прамысловай палаты, адзначыўшы, што гэта ўнікальная платформа для абмену вопытам, укаранення новых ідэй і тэхналогій, якая спрыяе павышэнню актуальнасці галіны і развіццю супрацоўніцтва паміж краінамі.

— Сёлета выязная выстава ІНАПРАМ пройдзе з удзелам прадпрыемстваў з дружалюбных краін, — падкрэслілі ў БелГПП.

Тут дадалі, што ў рамках выставы пройдзе шырокая дзелавая праграма, дзе будуць абмяркоўвацца тэмы адукацыйных рашэнняў для прамысловасці, развіцця інфраструктуры, кібербяспекі прадпрыемстваў, тэхналогій для энергетыкі, прамысловай кааперацыі, штучнага інтэлекту ў прамысловасці, тэхналогій для гарадоў, аўтаматызацыі вытворчасці, тэхналогій для хімічнай прамысловасці, інавацый, прамысловых IT-тэхналогій і машынабудавання.

Мясцовае Самакіраванне
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
26 лютага 2025 г. № 7 (788)



# І ДАЧА Ў ПРЫДАЧУ...

## Як мясцовыя ўлады знаходзяць паразуменне з садаводчымі таварыствамі на сваёй тэрыторыі

Яшчэ некалькі тыдняў — і пачнецца актыўны дачны сезон. Клопат не толькі саміх шчаслівых уладальнікаў лецішчаў, але і мясцовых сельсаветаў, на тэрыторыі якіх гэтыя лецішчы, дакладней садаводчыя таварыствы, знаходзяцца. Бо садаводчае таварыства — гэта не вёска і не пасёлак, гэта, так бы мовіць, «дзяржава ў дзяржаве», бо сельсавету яно фактычна не падпарадкоўваецца. У апошні час паўнамоцтвы мясцовай улады адносна садаводчых таварыстваў былі значна пашыраныя, але дасягнуць беспраблемнага суіснавання ўдаецца не заўсёды.
Мы пацікавіліся непасрэдна ў старшынь сельсаветаў у розных рэгёнах, як ім удаецца наладжваць кантакт з дачнікамі, якія нібыта і свае, а нібыта і не...

### ГАЗ, ЭЛЕКТРЫЧНАСЦЬ І КЛОПАТ З БОКУ ЎЛАД

Калі ваша дача знаходзіцца ў 10—15 хвілінах язды ад Мінска, дык чым не ідэальны варыянт? Больш падрабязна даведацца аб плюсах і мінусах жыцця ў садаводчых таварыствах прысталічча, іх узаемадзеянні з мясцовымі органамі ўлады мы вырашылі ў Бараўлянскім сельсавеце, на тэрыторыі якога налічваецца 12 садаводчых таварыстваў.

Паводле слоў **старшыні Бараўлянскага сельвыканкама Кацярыны ХМЫЛКОВАЙ,** многія людзі пражываюць у садаводчых таварыствах прысталічча на пастаяннай аснове: «Гэта, на мой погляд, абумоўлена блізкім размяшчэннем да сталіцы. Акрамя таго, Бараўляны з Мінскам злучаюць выдатныя транспартныя зносіны. У садаводчых таварыствах праведзены святло, газ, электрычнасць і многае іншае. Ды і невялікі домік блізка ад сталіцы — гэта вельмі выдатна. Многія людзі хочуць адпачываць ад гарадской мітусні, пабыць на прыродзе не толькі летам, але і зімой. Што датычыцца старшынь садаводчых таварыстваў, гэта людзі адказныя, якія жывуць сваёй працай. Адзіны мінус — не кожны можа дазволіць сабе перазімаваць на дачы, паколькі тарыфы на ацяпленне досыць вялікія».

Кантакт мясцовай улады з садаводчымі таварыствамі ажыццяўляецца за кошт узаемадзеяння старшыні сельсавета са старшынямі таварыстваў. «Мы даволі цесна ўзаемадзейнічаем са старшынямі садаводчых таварыстваў, некалькі разоў у год праводзім сумесныя рэйды з міліцыяй і МНС. Вядома, не ўсе задаволеныя такімі візітамі. Аднак ёсць і тыя, хто зацікаўлены ў камунікацыі з намі, хто ставіцца да гэтага станоўча. Людзі задаюць пытанні, якія іх цікавяць, і атрымліваюць падрабязныя адказы. Як правіла, кожны старшыня садаводчага таварыства ведае, у якіх дамах грамадзяне пражываюць на пастаяннай аснове. Менавіта на гэтыя дамы і робіцца акцэнт. На пасяджэнні Савета грамадскага правапарадку мы запрашаем суб'екты прафілактыкі, у якія ўваходзяць старшыні садаводчых таварыстваў. Такія сходы адбываюцца два разы на год. На гэтых сустрэчах мы агаворваем надзённыя праблемы. Дзесяці мы дзейнічаем сумесна, недзе падказваем кірунак, у якім неабходна рухацца, а калі трэба, то выязджаем на месцы, запрашаем уласніка дадзенага домаўладання на гутарку. Па большай частцы гэта дае станоўчы вынік. Што датычыцца ўзаемадзеяння па будаўнічых нормах, пабудовах, такія скаргі ўжо разглядае Мінскі райвыканкам. Але большая частка заяўнікаў спачатку прыходзіць да нас. Мы размаўляем з людзьмі, стараемся паглыбіцца ў іх праблемы, каб як можна хутчэй вырашыць іх. Часам даходзіць нават да таго, што мы проста запрашаем дваіх суседзяў, якія нешта паміж сабой не падзялілі, і стараемся іх прымірыць».

Не менш цікавым застаецца працэс далучэння садаводчага таварыства да населенага пункта. Паводле слоў старшыні Бараўлянскага сельсавета, для гэтага неабходна выканаць шэраг умоў. І ўмовы такія, што зрабіць са старых садаводчых таварыстваў пасёлкі практычна немагчыма: «Справа ў тым, што ўчасткі, як правіла, заціснутыя, а пажарныя разрывы паміж дамамі не выконваюцца. Мінімальная шырыня вулічна-дарожнай сеткі не дасягае неабходных шасці метраў, што з'яўляецца неадпаведнасцю нормам населеных пунктаў. Немалое значэнне ў гэтым маюць і пешаходныя дарожкі, дакладней іх адсутнасць.

Старшыня адзначыла, што ў Бараўлянскі сельсавет пакуль яшчэ не звярталіся людзі з пытаннямі трансфармацыі садаводчых таварыстваў у населеныя пункты. Зрэшты, тут няма і асаблівай неабходнасці: «У садаводчых таварыствах, размешчаных на тэрыторыі Бараўлянскага сельсавета, людзі пражываюць, як правіла, на пастаяннай аснове. На ўчастках у дачнікаў праведзены газ, электрычнасць і ўсё неабходнае для камфортнага пражывання не толькі ў гарачы сезон, але і ў суровую зіму».

### ДЗВЕ БЯДЫ — СМЕЦЦЕ І САБАКІ

Далёка не ўсюды адносіны мясцовай улады з членамі садаводчых таварыстваў можна назваць сяброўскімі. Пра дапамогу дачнікаў у навядзенні парадку на зямлі ці, правільней сказаць, неразвязденні звалак у месцах агульнага карыстання гаварыць няма чаго. Прынамсі, менавіта так можна сказаць пра сітуацыю, якая склалася ў многіх сельсаветах Гарадоцкага раёна Віцебскай вобласці, аднак спынімся на адным — Пальмінскім.

У складзе сельсавета шэсць буйных садаводчых таварыстваў, пяць з якіх — газіфікаваны. Адным словам, беларуская «рублёўка» на беразе шыкоўнага возера Лосвіда. Аднак тым не менш члены тых самых таварыстваў пастаянна сварацца паміж сабой нават з-за самых дробных пытанняў. Магчыма, таму спрыяе высокая шчыльнасць участкаў: шэсць сотак — вельмі мала, каб адпачыць ад суседскіх вачэй.

З прадстаўнікамі мясцовай улады як старшыні садаводчага таварыства, так і самі дачнікі, амаль не камунікуюць. «Нягледзячы на тое што з уступленнем у сілу абноўленага Указа № 155 «Аб садаводчых таварыствах» павысіліся роля і ўдзел мясцовай улады ў жыцці дачнікаў, канкрэтна ў нашым сельсавеце сітуацыя не змянілася. Выпадкаў назначэння старшыні садаводчага таварыства намі не было, дачнікі ўвогуле не вельмі любяць, калі хтосьці ўмешваецца ў іх дзейнасць. Зваротаў па прычыне пераводу дачнага дома ў разрад жылога таксама не было. Адзінае, з чым звярталіся дачнікі, — прасілі ўключыць таварыствы ў зону абслугоўвання аўтакрамы. Вядома, пытанне было прапрацавана, і ў сезон нестацыянарная крама забяспечвае дачнікаў усім неабходным», — расказала **старшыня Пальмінскага сельскага Савета дэпутатаў Анфія БЯРОЗКА.**

Накont старшынь таварыстваў, якіх выбіраюць самі дачнікі, пытанне двухбаковае. Па-першае, людзі на гэтай пасадзе мяняюцца даволі часта, па-другое, народныя выбраннікі нават не апавяшчаюць сельвыканкам аб змяненнях. Фактычна старшыня сельсавета не мае кантактаў, адпаведна, не можа падказаць нумар ахвотным набыць той ці іншы дачны ўчастак. Праз адсутнасць рэгістрацыі на дачах немагчыма падлічыць колькасць сезонных жыхароў.

Праблемы ў Пальмінскім сельсавеце, як і, бадай, ці не ў кожным, дзе ёсць садаводчыя таварыствы, аднолькавыя. Першая — звалкі смецця на прыпыначных пунктах і ўзбочынах дарог у дачны сезон. І, здаецца, арганізаваць вываз смецця трактарам, які збярэ мяшкі ўздоўж брамак, не так затратна і складана, дачнікі аддаюць перавагу ўладкаваць сметнік на прыпынку ці за ім. Хто павінен гэта прыбіраць — пытанне не іх адказнасці.

Другая праблема, з якой мясцовыя ўлады змагаюцца з году ў год, — безнаглядныя жывёлы, якія выходзяць у «самастойнае» жыццё якраз восенню, калі сезон дачных работ ужо скончыўся. Людзі бяруць на лета сабак, якіх пасля забраць у гарадскую кватэру, напэўна, няма магчымасці. Без усялякага сумлення безадказныя грамадзяне пакідаюць сваіх чатырохногіх сяброў на дачах, а сабакі ў пошуках ежы бадзяюцца па суседніх населеных пунктах, збіваюцца ў зграі, пужаюць дзяцей і здзяйсняюць набегі на вясковыя хлявы. «Мы рэгулярна праводзім сходы з удзелам спецыялістаў ЖКГ, заклікаем да сумлення і нагадваем аб адказнасці за жывёл, якіх прыручылі. Але ўсё безвынікова: прыходзіцца арганізоўваць адлоў», — адзначыла старшыня сельскага Савета.

### «САДАВОДЫ НАС ЧУЮЦЬ»

На тэрыторыі Магілёўскага раёна 171 садаводчае таварыства, што аб'ядноўвае прыблізна 40 тысяч насельніцтва. Пяць таварыстваў, сярод якіх такое буйное, як «Хімік», дзе 1200 домікаў, знаходзіцца на тэрыторыі Сідаравіцкага сельсавета.

**Алена ПШАНІЧНАЯ, старшыня Сідаравіцкага сельсавета,** заўсёды на прамой сувязі з садаводамі. Нават такое маленькае садаводчае таварыства, як «Лясная паляна», дзе ўсяго 33 домікі, патрабуе ўвагі. Сувязь трымаецца праз старшынь гэтых утварэнняў.

— Ладзім добра, садаводы мяне чуюць, — адзначае старшыня сельсавета. — Людзі звяртаюцца за рэгістрацыяй, з праблемнымі пытаннямі. Даём парады, дзесьці дапамагаем. Напрыклад, падказваем, дзе гной купіць, хто можа дапамагчы з тэхнікай. Звярнуліся неяк да нас з заявай, каб мы пачысцілі пажарную сажалку, але мы пагутарылі з жыхарамі, і яны пагадзіліся, што і самі могуць прыкласці свае сілы. Знайшоўся нават чалавек з трактарам. Прыехала па іх запрашэнні на свята, а ў іх — поўны парадак. Кажу: як прыгожа ў вас стала, не трэба нават дзяржаву напружваць.

Для жыхароў вёсак суседства з садаводчымі таварыствамі толькі ім на карысць — прадаюць ім малочныя прадукты, мяса. Раней малако прапаноўвалі, а цяпер смятану, сыры, масла. І попыт вялікі. На тэрыторыі таго ж «Хіміка» і ў выхадныя дні кірмашы праходзяць. Раней тут нават крама была, але цяпер яе замяніла аўтакрама ад райспажыўкааперацыі.

Аб пераводзе садаводчых таварыстваў у населеныя пункты размовы пакуль няма. Прычыны ўсё тыя ж, найперш — вузкія праезды. «На некаторых так званых вуліцах не тое што дзве машыны не могуць раз'ехацца, а нават веласіпедыст з машынай. Жыхары яшчэ дрэў і кустоў каля агароджаў панасаджвалі для прыгажосці. Параўняць дарожнае пакрыццё і тое немагчыма — грэйдэр не праедзе. Вулічнага асвятлення наогул няма, нават слупоў — садаводы аб гэтым не паклапаціліся», — расказвае Алена Пшанічная.

Зрэшты, магчыма, з часам самі дачнікі захочуць штосьці памяняць, бо жыццё і адпачынак на прыродзе становяцца ўсё больш папулярнымі.

— Сёлета наогул у «Хіміку» папрасілі, каб аўтобус хадзіў яшчэ і зімой, — аргументуе Алена Пшанічная. — У пятніцу, суботу, нядзелю ён курсіруе пастаянна. Раней ездзіў толькі з вясны да восені.

Між тым прапісацца ў садаводчых таварыствах немагчыма, можна толькі аформіць часовую рэгістрацыю. А людзі ўсё часцей жывуць у гэтых дамах пастаянна і яшчэ нешта прыбудоўваюць. Апошнім часам на гэтых участках сталі з'яўляцца квадрадамы. Дарэчы, гэта вельмі зручна. Нічога будаваць не трэба — купіў, прывёз, паставіў і жыві.

**Старшыня Магілёўскага райсавета Сяргей ЯРОШЧАНКА** апісвае карціну ў цэлым:

— Садаводчыя таварыствы ў нас на кантролі, мы іх пастаянна маніторым. У буйныя садаводчыя таварыствы нават аўталаўкі ходзяць. Дзяржава клапоціцца пра людзей. Але шмат пытанняў адкрытыя. Пад'язныя дарогі і тыя, уздоўж якіх стаяць іх дамы, садаводы павінны ўтрымліваць самі — яны ж самастойныя юрыдычныя асобы. Павінны думаць і аб вывазе смецця — заключаць дагавор з абслуговай арганізацыяй. Некаторыя гэтага пазбягаюць, а мы потым здзіўляемся, адкуль звалкі ў лесе. З гэтым сапраўды вельмі складана. Вядома, што сельсаветы не пакідаюць садаводаў без увагі. Стараемся вырашаць іх праблемы. Пачынаецца дачны сезон — пачынаюцца звароты: то па водаадвядзенні, то па падтапленні, то яшчэ што. Просяць, каб прыпынак зрабілі, грамадскі транспарт пусцілі... У Савеце Рэспублікі вывучаюць гэтае пытанне, было даручэнне Наталлі Качанавай маніторыць абстаноўку на месцах. Як толькі садаводы пачнуць заязджаць, ізноў будзем шукаць разам з імі кампрамісныя рашэнні праблем. Трэба пачуць, што яны прапануюць, а потым думаць, як гэта падвесці да рэзультату, прымальнага для ўсіх.

**Даніiл ХМЯЛЬНІЦКІ, Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении электронных торгов в форме открытого аукциона**

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| Продавец | ОАО «Потсдам», г. Лида, Гродненская обл., г. Лида, ул. Летная, 4 |
| **Оператор / Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов (имущество, реализуемое одним лотом)**

**Здание кафе «Полюс»** (здание специализированное для общественного питания), инв. № 420/С-4701, общ. пл. 533,3 кв. м, по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, ***г. Лида, ул. 3-я Куйбышева, 1.*** Составные части и принадлежности: в-Водопроводная сеть, а-Канализационная сеть, б-Тепловая сеть, г-Сооружение благоустройства. ***Обременение:*** договор аренды.

**Здание пункта приема стеклотары** (здание неустановленного назначения), инв. № 420/С-4740, общ. пл. 76,1 кв. м, по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, ***г. Лида, ул. 3-я Куйбышева, 3***. Составные части и принадлежности: Б1/к-Склад, В1/к-Склад, (Б1/к)-Погреб, а-Сооружения благоустройства.
В состав лота входит иное имущество, подробнее ознакомиться можно на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

**Сведения о земельных участках: 1** – общ. пл. 0,1640 га предоставлен продавцу для размещения объектов общественного питания на праве постоянного пользования. **2** – общ. пл. 0,0283 га предоставлен продавцу для обслуживания пункта приема стеклотары на праве постоянного пользования

**Начальная цена лота с НДС 20 % — 655 104,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 15 (пятнадцать)** рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты организатору торгов на их проведение и затраты за проведение независимой оценки продавцу, также оплатить организатору торгов установленное вознаграждение **3 %** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 13.00 31.03.2025.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 28.03.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**



**Уважаемые акционеры ОАО «ИНСТИТУТ «МИНСКГРАЖДАНПРОЕКТ»»,**

**27 марта 2025 года состоится годовое общее собрание акционеров ОАО «ИНСТИТУТ «МИНСКГРАЖДАНПРОЕКТ»», по адресу: г. Минск, ул. Коллекторная, 20ª, конференц-зал.**

**Повестка дня собрания**

1. Об утверждении годового отчета Общества за 2024 год и ключевых показателей Общества на 2025 год.
2. О работе Наблюдательного совета в 2024 году.
3. О результатах аудита и проверки Ревизионной комиссией финансовой и хозяйственной деятельности Общества за 2024 год.
4. Об утверждении годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2024 год.
5. О распределении прибыли и убытков за 2024 год и выплате дивидендов по итогам работы Общества за 2024 год.
6. О направлениях использования прибыли Общества на 2025 год.
7. Об избрании членов наблюдательного совета Общества.
8. Об избрании ревизионной комиссии Общества.
9. Об определении размера вознаграждения (компенсации расходов) членам наблюдательного совета, в том числе представителю государства, ревизионной комиссии (ревизору) за исполнение ими своих обязанностей.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Коллекторная, 20ª, комн. 301 (приемная) с 19 по 26 марта 2025 года (с 10.00 до 16.00) либо 27 марта по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания с 14.30 до15.00 по месту проведения собрания.
Начало работы собрания – 27 марта 2025 года, 15.00.

Список лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров, составляется на основании реестра владельцев ценных бумаг Общества.
Для регистрации при себе необходимо иметь следующие документы:
- акционеру общества (физическое лицо) – паспорт;
- руководителю (представителю) юридического лица, являющегося акционером, – документ, подтверждающий его должностное положение, и паспорт;
- представителю акционера – паспорт и доверенность.

**Наблюдательный совет ОАО «ИНСТИТУТ «МИНСКГРАЖДАНПРОЕКТ»».**

УНП 600013280


# «НА МЕСЦАХ ЛЕПШ ВІДАЦЬ, ЯК РЭАГАВАЦЬ НА ЗАПЫТЫ ГРАМАДСТВА»

## Парламентарыі — аб узмацненні паўнамоцтваў старшынь базавых выканкамаў

Падпісаны ў канцы мінулага тыдня Указ Прэзідэнта № 74 «Аб узмацненні ролі старшынь выканаўчых камітэтаў базавага ўзроўню ў развіцці рэгіёнаў» без перабольшвання можна назваць знакавым дакументам, які паўплывае на дзейнасць менавіта мясцовай улады. Прычым вельмі хутка — указ уступае ў сілу ўжо з 1 сакавіка. А як бачаць яго заканадаўцы рэспубліканскага ўзроўню — члены Савета Рэспублікі і дэпутаты Палаты прадстаўнікоў?

**Ігар СЯРГЕЕЎ, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, генеральны дырэктар ААТ «Беларускі цэментны завод»:**



— З прыняццем гэтага ўказа ў кіраўнікоў раённай і гарадской вертыкалі з'явілася магчымасць аператыўна прымаць рашэнні, пачынаць працаваць і развівацца менавіта ў тым кірунку, які неабходны канкрэтнаму рэгіёну. Сітуацыю на месцах ніхто лепш за мясцовую ўладу не ведае. На ўказе прадугледжана выкарыстанне зямельных, кадравых, фінансавых рэсурсаў, а таксама надзяленне паўнамоцтвамі па добраўпарадкаванні.

**Адно з новаўвядзенняў звязана з надзяленнем правам мясцовых распарадчых органаў прыцягваць суб'екты гаспадарання розных форм уласнасці, незалежна ад падпарадкаванасці, для ўдзелу ў добраўпарадкаванні і навядзенні парадку на замацаванай тэрыторыі.**

Гэта, безумоўна, правільна, бо ўсе мы пражываем, працуем і адпачываем на адной тэрыторыі. Такім чынам, кожны павінен зрабіць свой унёсак у яе далейшае развіццё і росквіт. Асабліва гэта актуальна ў Год добраўпарадкавання і пяцігодку якасці. Зразумела, новаўвядзенні пацягнуць зусім іншую адказнасць кіраўнікоў рэгіёнаў на месцах і павысяць узровень выканальніцкай дысцыпліны. Бо старшыні раённых і гарадскіх выканаўчых камітэтаў нясуць адказнасць за выкананне ўсіх дзяржаўных паказчыкаў, развіццё свайго рэгіёна і дабрабыт кожнага яго жыхара.

**Дзмітрый ЗАХАРЧУК, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, старшыня Ваўкавыскага райвыканкама:**



— Прамы пасыл Прэзідэнта такі: не рэвалюцыя, а эвалюцыя. Усё трэба рабіць планамерна. Таму Указ Прэзідэнта «Аб узмацненні ролі старшынь выканаўчых камітэтаў базавага ўзроўню ў развіцці рэгіёнаў» — чарговы паступальны крок для ўмацавання ролі мясцовай улады. Бо на месцах лепш відаць, як адрэагаваць на той ці іншы запыт грамадства. Ды і раён раёну розніца. Таму ўніверсальных падыходаў да вырашэння задач быць не можа, кожны ў сваім раёне павінен дзейнічаць зыходзячы з сітуацыі.

**Безумоўна, указ павышае ролю кіраўніка, дае яму больш паўнамоцтваў, фінансавай свабоды, але і адказнасці таксама больш. З вельмі сур'ёзных палажэнняў ва ўказе — выканальніцкая дысцыпліна, абавязковасць выканання распараджэнняў і прадпісанняў старшыні выканкама (невыкананне цягне адміністрацыйную адказнасць).**

Што да фінансавай свабоды, указ прадугледжвае пры павелічэнні даходнай часткі бюджэту прадпрыемства свабодныя рэшткі сродкаў накіроўваць на сваё меркаванне туды, куды найбольш неабходна. Нашмат спрашчаецца вырашэнне пытанняў, звязаных з прыцягненнем будаўнічых арганізацый. Больш свабоднымі становімся і ў рамках навядзення парадку — добраўпарадкавання без праекта. Гэта эканоміць вялікія сродкі. Шырокія магчымасці дае і механізм аднясення затрат не на асноўную фінансавую дзейнасць, а на дадатковы капітал, што не пагаршае эканамічных паказчыкаў прадпрыемства.

Дзякуючы ўказу з'явілася магчымасць больш шырока прыцягваць не толькі дзяржаўны, але і прыватны бізнес да пытанняў навядзення парадку на тэрыторыі раёна. Усё разам абяцае даць выдатны эфект.

**Алег ДЗЯЧЭНКА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў:**



— Ідэя ўказа дакладная і ўсім зразумелая — пераразмеркаваць уладныя паўнамоцтвы такім чынам, каб на месцах узмацніўся ўплыў выканкамаў і іх старшыняў на сітуацыю ў кожным раёне. Бо на «зямлі» лепш відаць, што і як трэба зрабіць у інтарэсах людзей з улікам патэнцыялу, запатрабаванняў і самабытнасці падсправаздачных тэрыторый.

Указ надасць больш упэўненасці кіраўнікам на месцах у вырашэнні розных кадравых, фінансавых і іншых пытанняў. Акрамя таго, узаемадзеянне паміж дзяржавай і прыватным сектарам атрымае новы імпульс у развіцці і ўзніме на якасна новы ўзровень сацыяльную адказнасць «прыватнікаў» перад грамадствам і дзяржавай. У Год добраўпарадкавання арганізацыі прыватнай формы ўласнасці змогуць актыўна ўключыцца ў працэс добраўпарадкавання тэрыторый у сельскіх і гарадскіх населеных пунктах, зрабіўшы гэту работу сістэмнай і ўсёабдымнай.

**Антон КАРАНКЕВІЧ, член Пастаяннай камісіі па прамысловасці, энергетыцы, транспарце, сувязі і лічбавым развіцці Палаты прадстаўнікоў:**



— Пашырэнне паўнамоцтваў старшынь выканаўчых камітэтаў дазволіць прымаць рашэнні, якія непасрэдна ўплываюць на жыццё грамадзян. Напрыклад, кіраўнікі выканкамаў змогуць самастойна вызначаць прыярытэтныя кірункі развіцця сваіх рэгіёнаў, што будзе садзейнічаць больш мэтанакіраванаму выкарыстанню бюджэтных сродкаў і рэсурсаў. Такі падыход дасць магчымасць улічваць спецыфіку кожнага рэгіёна і адаптаваць рашэнні да яго ўнікальных умоў.

**Наталля ТАРАСЕНКА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па экалогіі і прыродакарыстанні Палаты прадстаўнікоў:**



— Указ — гэта своечасовы і прадуманы крок па ажыццяўленні мер, накіраваных на ўмацаванне пазіцыі мясцовых органаў улады, павышэнне эфектыўнасці іх дзейнасці, пашырэнне магчымасцяў кіраўнікоў базавага ўзроўню для неабходных пераўтварэнняў у рэгіёнах, галоўнай мэтай якіх з'яўляецца паляпшэнне якасці жыцця беларускіх грамадзян.

Так, цяпер толькі па папярэднім узгадненні з рай-, гарвыканкамамі будуць прымацца рашэнні па спыненні дзейнасці значных сацыяльна-бытавых аб'ектаў (што асабліва актуальна для сельскай мясцовасці) або прыпыненні дзейнасці асобных арганізацый, што дасць магчымасць максімальна ўлічваць інтарэсы грамадзян і перспектывы развіцця населеных пунктаў.

## АДЗІНЫ ДЗЕНЬ ПРЫЁМУ ГРАМАДЗЯН — НА МІНШЧЫНЕ

Традыцыйны адзіны дзень прыёму грамадзян, які члены Савета Рэспублікі праводзяць у рэгіёнах краіны, 3 сакавіка пройдзе ў Мінскай вобласці, паведамілі ў прэс-службе Савета Рэспублікі.

**Прыёмы правядуць:**

- Старшыня Савета Рэспублікі **Наталля Іванаўна КАЧАНАВА** — з 10.00 у Барысаўскім райвыканкаме;

намеснік Старшыні Савета Рэспублікі **Сяргей Мікалаевіч ХАМЕНКА** — з 10.00 у Лагойскім райвыканкаме;

- старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы **Сяргей Фёдаравіч АЛЕЙНІК** — з 10.00 у Смалявіцкім райвыканкаме;
- старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні **Леанід Канстанцінавіч ЗАЯЦ** — з 10.00 у Вілейскім райвыканкаме;
- старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве **Міхаіл Іванавіч РУСЫ** — з 10.00 у Чэрвеньскім райвыканкаме;
- старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці **Сяргей Міхайлавіч СІВЕЦ** — з 10.00 у Мядзельскім райвыканкаме;
- старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах **Уладзіслаў Вікенцьевіч ТАТАРЫНОВІЧ** — з 10.00 у Валожынскім райвыканкаме;
- намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці **Дзмітрый Юр'евіч БАСКАЎ** — з 09.00 у Бярэзінскім райвыканкаме;
- намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве **Аляксей Аляксандравіч ВАСІЛЬЕЎ** — з 10.00 у Дзяржынскім райвыканкаме;
- намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні **Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ** — з 10.00 у Слуцкім райвыканкаме;
- член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве **Гарык Тарыелавіч БАРСАМЯН** — з 10.00 у Мінскім райвыканкаме;
- член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці **Наталля Леанідаўна ГЛІНСКАЯ** — з 10.00 у Маладзечанскім райвыканкаме;
- член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці **Алена Васільеўна ЖУРАЎЛЁВА** — з 10.00 у Капыльскім райвыканкаме;
- член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці **Марына Аляксандраўна ІЛЬІНА** — з 10.00 у Стаўбцоўскім райвыканкаме;
- член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці **Віктар Аляксандравіч КАНДРАТОВІЧ** — з 10.00 ва Уздзенскім райвыканкаме;
- член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці **Тамара Пятроўна КРАСОЎСКАЯ** — з 10.00 у Пухавіцкім райвыканкаме;
- член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы **Аляксандр Сяргеевіч ЛУК'ЯНАЎ** — з 10.00 у Нясвіжскім райвыканкаме;
- член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах **Аляксандр Аляксандравіч НОВІКАЎ** — з 10.00 у Старадарожскім райвыканкаме;
- член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы **Канстанцін Мікалаевіч СІРОЦІН** — з 10.00 у Любанскім райвыканкаме;
- член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы **Ала Віктараўна СМАЛЯК** — з 11.00 у Салігорскім райвыканкаме;
- член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве **Іна Уладзіміраўна ТАЛКАЧОВА** — з 10.00 у Клецкім райвыканкаме;
- член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах **Алена Пятроўна ФУРС** — з 11.00 у Крупскім райвыканкаме.

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

## ВЫСЛУХАЦЬ І ДАПАМАГЧЫ

### Як малады парламентарый вырашае праблемы насельніцтва ў сваім рэгіёне



Уладзімір ПАЎЛОЎСКІ, нягледзячы на свае 30 гадоў, мае вялікі вопыт грамадскай дзейнасці. Быў кіраўніком Горацкага райкама БРСМ, потым абласнога камітэта гэтай арганізацыі, уваходзіў у склад Маладзёжнай палаты пры Парламенцкім сходзе Саюза Беларусі і Расіі. Сёння ў якасці дэпутата Палаты прадстаўнікоў клапоціцца пра дабрабыт жыхароў Горацкай выбарчай акругі № 82. Для яго гэты раён вельмі блізкі і зразумелы, бо тут яго малая радзіма.

Дэпутат правёў прыём грамадзян у Горацкім райвыканкаме Магілёўскай вобласці. Жыхарку Горак цікавіла будаўніцтва водаправода ў вёсцы Тосна Паршынскага сельсавета, дзе яна жыве летам. У населеным пункце ўсяго 33 чалавекі, амаль палова з іх — працаздольнага ўзросту. Па словах заяўніцы, людзі не супраць паўдзельнічаць у будаўніцтве сістэмы водазабеспячэння.

**Старшыня райсавета дэпутатаў Максім ПАТАПЕНКА,** які прысутнічаў на прыёме, пацвердзіў, што гэта пытанне падымалася на сустрэчах з насельніцтвам не ўпершыню, але будаўніцтва водаправода патрабуе вельмі вялікіх фінансавых укладанняў. Пытанне ўзятае на кантроль, вывучаюцца шляхі яго вырашэння.

Яшчэ адна жанчына пахадайнічала ад раённага прафкама работнікаў адукацыі аб унясенні паправак у заканадаўства. Справа ў тым, што педагогі, калі працаўладкоўваюцца на месца работніка, які часова не выконвае свае абавязкі, напрыклад знаходзіцца ў дэкрэтным водпуску, не маюць магчымасці заключыць кантракт. Гэта значыць, што ў іх няма права і на важкую надбаўку да зарплаты. «Сярод тых, хто прыходзіць на падмену, у тым ліку і маладыя настаўнікі. Хацелася б, каб яны замацаваліся ў прафесіі. А для гэтага павінна быць годная зарплата», — аргументавала заяўніца.

Акрамя гэтых пытанняў, на кантроль узятыя звароты наконт чэкаў «Жыллё» і набыцця маёмасці.

— Людзі прыходзяць з надзеяй, што іх праблемы вырашацца на іх карысць, але, бывае, што па аб'ектыўных прычынах гэта немагчыма, бо закон прадугледжвае іншае вырашэнне пытання, — кажа парламентарый. — Радуе, што ёсць людзі, якія ўдзельнічаюць у жыцці рэгіёна, прапаноўваюць нешта для яго развіцця.

У вырашэнні грамадскіх праблем задзейнічаны ўсе: мясцовая ўлада, дэпутаты, суб'екты гаспадарання. Атрымалася вырашыць пытанне, як той казаў, «з барадой». На працягу дзесяці гадоў прыхаджане праваслаўнага храма ў Горках звярталіся ў розныя інстанцыі, каб ім зрабілі ацяпленне. Дзякуючы сумесным намаганням там цяпер устаноўлена сістэма «цёплая падлога». І народны выбраннік асабіста пераканаўся, што функцыянуе яна справна.

Пяцігодка якасці абавязвае больш дасканала адсочваць сітуацыю ў акрузе. На мінулым тыдні Уладзімір Паўлоўскі выяўляў, якія праблемныя пытанні ёсць сёння ў камунальнай сферы і сістэме адукацыі. На горацкім прадпрыемстве «Камунальнік» яму расказалі, як ідзе работа са зваротамі грамадзян. На працягу месяца ў адзіную інфармацыйную службу «115» з Горацкага раёна паступае ў сярэднім 150 заявак. На фоне вобласці гэта трэці вынік пасля Магілёва і Бабруйска. Парламентарыю расказалі, з якімі праблемамі звяртаюцца жыхары і што пажадана зрабіць на заканадаўчым узроўні, каб работа камунальнай службы стала больш эфектыўнай.

На сустрэчы з кіраўнікамі ўстаноў адукацыі таксама прагучалі прапановы. Педагогі выказаліся за тое, каб у новым законе па пытаннях забеспячэння правоў дзяцей, які нядаўна быў разгледжаны ў першым чытанні ў Палаце прадстаўнікоў, была прадугледжана адказнасць бацькоў за супрацьпраўныя дзеянні іх нашчадкаў у сетцы інтэрнэт. Настаўнікі таксама звярнулі ўвагу на сацыяльныя выплаты на дзяцей-сірот. На тых, якія ўсыноўлены, грошы пералічваюцца да 16 гадоў, а на неўсыноўленых — на два гады даўжэй, да іх паўналецця. На думку настаўнікаў, трэба было б зраўнаваць тэрміны гэтых выплат. Народны выбраннік паабяцаў агучыць іх прапановы ў парламенце.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва Уладзіміра ПАЎЛОЎСКАГА.**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторных электронных торгов**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | Смолевичское райпо, Минская обл., г. Смолевичи, ул. Советская, д.133. УНП 600048660 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638 — **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Лот № 1: здание магазина (1873 кв. м,** 614/С-19321, составные части: подвал). Адрес: **Минская обл., Смолевичский р-н, Озерицко-Слободской с/с, аг. Слобода, ул. Молодежная, 1Б.** ***Сведения о земельном участке:*** общ. пл. **0,1314** га предоставлен на праве аренды (срок действия по 07.01.2068) для обслуживания здания магазина № 40. ***Обременения*:** площади здания магазина частично сданы в аренду.

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 2 952 782,00 бел. руб.** (снижена на 20 %)

**Лот № 2: здание магазина**
(**137,7 кв. м,** инв. номер 614/С-18998, составные части: две холодные пристройки, сарай, уборная). Адрес: **Минская обл., Смолевичский р-н, Заболотский с/с, д. Старина, ул. Центральная, 31А.** ***Сведения о земельном участке:*** предоставлен на праве постоянного пользования общ. пл. **0,1356** га для обслуживания здания магазина

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 37 200,00 бел. руб.** (снижена на 20 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** в течение **30** календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере по лоту № 1 – 2 %, по лоту № 2 – 6 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения торгов

Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда»: по лоту № 1 – 19.12.2024, по лоту № 2 – 20.11.2024

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 18.03.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 17.03.2024 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**

**Годовое общее собрание акционеров ОАО «МинскСортСемОвощ»**
(220014, г. Минск, ул. Кузьмы Минина, д. 21, корп. 1)

по решению наблюдательного совета Общества состоится в очной форме **28 марта 2025 года.**

**Повестка для собрания**

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2024 год и основные направления его деятельности в 2025 году.
2. Отчет наблюдательного совета Общества.
3. Заключение ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности Общества за 2024 год.
4. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности, отчета о прибылях и убытках Общества за 2024 год с учетом заключения ревизионной комиссии и аудиторского заключения.
5. Утверждение распределения чистой прибыли за 2024 год и направлений использования чистой прибыли в 2025 году. Выплата дивидендов за 2024 год.
6. Утверждение условий материального вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
7. Избрание членов наблюдательного совета Общества.
8. Избрание членов ревизионной комиссии Общества.
9. Утверждение отчета комиссии по оказанию безвозмездной (спонсорской) помощи за 2024 год и суммы предоставляемой безвозмездной (спонсорской) помощи на 2025 год.

**Место проведения собрания:** г. Минск, ул. Кузьмы Минина, д. 21, корп. 1 (актовый зал).
**Начало собрания:** 09.00.
Время регистрации участников – в день проведения собрания с 08.30 до 08.55 по месту проведения собрания.
Время ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания – с 09.00 до 16.00 в рабочие дни (понедельник–четверг), с 09.00 до 15.45 (пятница), начиная с 07 марта 2025 года, по адресу: г. Минск, ул. Кузьмы Минина, 21, корп. 1.
Список акционеров для участия в собрании будет составлен на основании реестра по состоянию на 03 марта 2025 года.
Регистрация акционеров проводится по паспорту, а представителей акционеров – по паспорту и доверенности.

**Наблюдательный совет ОАО «МинскСортСемОвощ».**

УНП 600052664

Утерянное свидетельство о государственной регистрации общества с ограниченной ответственностью «Партнер Ивент» (УНП 193623972) **считать недействительным**.

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Лидахлебопродукт», Гродненская область, г. Лида, ул. Булата, 1. УНП 500022448. Тел. (0154) 65 25 01 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638 – **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Лот № 1: здание магазина** (инв. № 420/С-47477, **141 кв. м,** составные части: погреб). Адрес: **Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Докучаева, 28А**

***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,0310 га** предоставлен на праве постоянного пользования для размещения объектов розничной торговли

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 60 960,00 бел. руб.** (снижена на 60 %)

**Лот № 2: здание бани** (инвент. №: 430/С-61953, **45,2 кв. м**). Адрес: **Гродненская обл., Новогрудский р-н, Петревичский с/с, 50, здание бани юго-западнее д. Василевичи**

***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,0691** га предоставлен на праве аренды по 29.07.2072 для строительства и обслуживания здания бани. Ограничения (обременения): придорожная полоса (контролируемая зона) автомобильных дорог

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 2 462,84 бел. руб.** (снижена на 20 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 рабочих дней** после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи. Расходы, связанные с государственной регистрацией сделки, несет покупатель

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить продавцу и организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере по лоту № 1 – 6 %, по лоту № 2 – 10 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения торгов

Предыдущая публикация извещения в газете «Звязда»: 25.01.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 14.03.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 13.03.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

**28 марта 2025 года в 12.00**

**состоится очередное общее собрание акционеров совместного предприятия закрытое акционерное общество**

**«Могилевский химкомбинат «Заря»**

**с повесткой дня:**

1. Отчет директора о проделанной работе за 2024 год.
2. Итоги производственно-хозяйственной деятельности СП ЗАО «МХЗ» за 2024 год.
Утверждение годовых отчетов, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности за 2024 год.
3. Об утверждении распределения прибыли (убытков) по результатам работы за 2024 г.
4. Отчет ревизионной комиссии.
5. Основные направления деятельности СП ЗАО «МХЗ» на 2025 год. Утверждение плана производства, финансового плана и плана организационно-технических мероприятий на 2025 год.

Начало регистрации участников собрания **в 11.00.**
Окончание регистрации **в 11.50.**
Место проведения собрания: **г. Могилев, пр. Шмидта, 114.**

Лица, имеющие право на участие в собрании, имеют право ознакомиться с материалами к собранию в рабочие дни по адресу: **г. Могилев, пр. Шмидта, 114 с 10 марта 2025 г.**

Регистрация производится при предъявлении документа, удостоверяющего личность, для представителя акционера – паспорт и доверенность.

*Наблюдательный совет.*

УНП 700210051

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
информирует о проведении электронных торгов
по продаже имущества, принадлежащего
**Государственной фельдъегерской службе** (Продавец)
на праве оперативного управления.

**Электронные торги состоятся 31.03.2025.**

**Лот № 1:** ФОЛЬКСВАГЕН «КЭДДИ»,
кузов (рама) № WV2ZZZ2KZ7X064569.
Начальная цена без НДС – 14 800,00 руб.
Местонахождение: г. Минск, ул. К. Маркса, 16.
Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by. Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

# РАМОНТ ЛЕСВІЦ, НОВЫЯ ВУЛІЦЫ І ПРАЕЗД ДЛЯ ТРЭЦЯКУРСНІКАЎ

**Рашэнні сесіі Мінскага гарсавета будуць цікавыя многім жыхарам сталіцы**

Падчас 9-й пазачарговай сесіі Мінскага гарадскога савета дэпутатаў былі зменены некаторыя прынятыя раней рашэнні і зацверджаны новыя. Пытанняў, вынесеных на абмеркаванне, было шмат. Спынімся на некаторых з іх.



Фота «Минск-новости».

## Каб было прыгажэй і камфортней

Гарадскія ўлады працягваюць работу па стварэнні камфортных умоў для мінчан. У мінулым годзе былі выкананы ўсе запланаваныя мерапрыемствы па добраўпарадкаванні. Асаблівая ўвага ўдзялялася рамонту дарог, дваровых праездаў, высадцы зялёных насаджэнняў і афарбоўцы фасадаў будынкаў. У прыярытэце на 2025-ы — паляпшэнне тэрыторый жылой забудовы. Плануецца правесці работы ў 1033 дварах. Нагадаем, што ў 2022—2024 гадах штогод добраўпарадкоўвалася ў сярэднім 860 двароў.

У рамках паляпшэння стану прыдамавых тэрыторый плануецца рамонт праездаў, а менавіта — абнаўленне дарожнага пакрыцця плошчай 464,6 тысячы квадратных метраў. Можна заўважыць невялікае зніжэнне аб'ёму работ у параўнанні з мінулым годам, але разам з тым абяцаюць павысіць якасць рамонту. У мінулым годзе поўная замена пакрыцця складала 55 % ад усіх праведзеных работ. У 2025-м гэты паказчык плануецца павялічыць да мінімум 71 %.

Але і гэта яшчэ не ўсё. У планах на 2025 год — рамонт 1885 тысяч квадратных метраў дарог Мінска. Аднак варта ўлічыць, што гэта лічба можа змяніцца пасля вясновага агляду. Асаблівая ўвага таксама будзе аддадзена лесвіцам, размешчаным як на прыдамавых тэрыторыях, так і на землях агульнага карыстання.

Адна з праблем, з якой сутыкаюцца жыхары сектара індывідуальнай жылой забудовы, — дрэнны тэхнічны і эстэтычны стан агароджаў зямельных участкаў. Таму ў 2025 годзе заменяць больш як 33 кіламетры агароджаў. Гэта ў два разы болей, чым у папярэднія гады. Ёсць і бліжэйшыя планы: вясной гарадскія ўлады будуць прыводзіць у парадак тэрыторыі агульнага карыстання, што знаходзяцца побач з прыватнымі ўчасткамі, у тым ліку зоймуцца іх азеляненнем.

## Інвестыцыі ў будучыню

Змены былі ўнесены ў зацверджаную раней Інвестыцыйную праграму Мінска на 2025 год. Рэшта бюджэту мінулага года ў памеры 3,6 мільёна рублёў будзе накіравана на будаўніцтва малочнатаварных комплексаў. Гэта шэсць аб'ектаў у Віцебскай, Гомельскай і Магілёўскай абласцях — па два комплексы ў кожнай. Быў павялічаны да 1,8 мільярда рублёў і агульны аб'ём Інвестыцыйнай праграмы на бягучы год.

Паскорыць тэмпы развіцця інфраструктуры сталіцы закліканы дадатковыя сродкі, выдзеленыя на рэалізацыю розных будаўнічых праектаў. Адзін з прыярытэтных праектаў фінансавання — трэцяя лінія Мінскага метрапалітэна. Так, 17,5 мільёна рублёў пойдуць на аплату работ на першым яе ўчастку. Яшчэ 8,5 мільёна рублёў выдзеляць на аплату будаўніцтва сістэмы водазабеспячэння з падземных крыніц. На рэканструкцыю і рэстаўрацыю капітальных пабудоў на вуліцы Чыжэўскіх і ў праездзе Чыжэўскіх спатрэбіцца яшчэ 7 мільёнаў. А 3,4 мільёна рублёў гарадскія ўлады выдзяляюць на завяршэнне будаўніцтва фізкультурна-аздараўленчага комплексу на вуліцы Янкі Лучыны.

## Новыя імёны на карце Мінска

Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў прыняў рашэнне аб прысваенні новых назваў некалькім сталічным вуліцам і скверу. Часткай гарадскога ландшафту ў хуткім часе стане вуліца № 10, размешчаная ў раёне жылой забудовы на скрыжаванні вуліц Рафіева і Ясеніна. Яна атрымае назву — вуліца Бацькі Міная. Гэта даніна павагі Мінаю Шмырову — Герою Савецкага Саюза і камандзіру партызанскага атрада. А вуліца, якая злучае вул. Маршала Лосіка і вул. № 10, будзе насіць назву завулак Вяршынны.

Некаторыя вуліцы жылога комплексу «Утульны» таксама будуць перайменаваны. Так, вуліца № 6 атрымае назву «Дыпламатычная», бо побач плануецца размяшчэнне будынкаў дыпламатычнага корпуса. У сваю чаргу, вуліца № 7 будзе названа ў гонар Андрэя Грамыкі — выдатнага дзяржаўнага дзеяча, міністра замежных спраў СССР. Таксама разглядаецца магчымасць прысваення адной з вуліц жылога комплексу імя Анатоля Гурыновіча — вядомага дыпламата, міністра замежных спраў БССР.

А вось сквер на вул. Каржанеўскага, каля Палаца спорту «Курасоўшчына», ААТ «Інтэграл» і ўстановы «Мінскі гарадскі цэнтр алімпійскага рэзерву «Атлет»», цяпер будзе насіць імя Пятра Гайдэнкі. Гэта прызнанне заслуг генеральнага дырэктара вытворчага аб'яднання «Інтэграл» перад нашай краінай за ўклад у развіццё беларускай электроннай прамысловасці.

## У дапамогу моладзі

З 1 верасня да 30 чэрвеня студэнты першых і другіх курсаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў Мінска і Мінскага раёна маюць права бясплатна ездзіць у грамадскім транспарце горада. Тое ж самае датычыцца і школьнікаў. Праўда, для гэтага ім неабходны вучнёўскі білет ці даведка з указаннем населенага пункта пражывання і месца вучобы. Цяпер жа права бясплатнага праезду ў грамадскім транспарце плануецца распаўсюдзіць і на трэцякурснікаў дзённых аддзяленняў устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Па словах дэпутатаў, гэтая мера заклікана матываваць маладых людзей атрымліваць працоўныя прафесіі. З цягам часу, магчыма, ёю змогуць карыстацца і непаўналетнія выпускнікі каледжаў, якія працягваюць адукацыю ў ВНУ па скарочанай форме навучання.

**Аміна НАЗАРАВА.**

Мясцовае Самакіраванне
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 11 384. Нумар падпісаны ў 19.30 25 лютага 2025 года.**

# ЗАХАВАЦЬ ПАМЯЦЬ ДЛЯ ПАКАЛЕННЯЎ

**Днямі ў Дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны далі старт новаму этапу агульнарэспубліканскай акцыі «Разам з мастацтвам», якую праводзіць Маладзёжны тэатр эстрады пры падтрымцы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Сёлета ў планах арганізатараў — папоўніць геаграфію маштабнага мерапрыемства 18 новымі маршрутамі. Усе дыялогавыя пляцоўкі і канцэртныя праграмы прымеркаваныя да 80-годдзя Вялікай Перамогі і пройдуць пад дэвізам «Слава Пераможцам!».**




— Акцыя «Разам з мастацтвам» — гэта выдатная нагода нам, людзям мастацтва, гаварыць пра найважнейшыя тэмы, якія ўсіх моцна хвалююць. І цяпер мы даём старт новай тэме, новай падзеі ў жыцці нашай краіны напярэдадні 80-годдзя Вялікай Перамогі, — адзначыў **міністр культуры, заслужаны артыст Беларусі Руслан ЧАРНЕЦКІ.** — Ведаеце, напярэдадні такіх свят вельмі многія задаюцца пытаннем: ці не шмат мы гаворым аб Перамозе, аб унёску беларусаў і ўсяго савецкага народа ў Вялікую Перамогу? Не, сябры, наадварот, мы гаворым мала. Бо подзвіг, які здзейснілі нашы продкі, — гэта тое, пра што мы абавязаны гаварыць. І мастацтва — цудоўны інструмент, які можа дапамагчы данесці і той боль, і тую радасць, што перажылі нашы продкі, каб у нас сёння было яснае сонечнае неба над галавой.

Варта адзначыць, што сёлета мэта акцыі — падкрэсліць унёсак беларускага народа і дзеячаў культуры ў Вялікую Перамогу, а таксама аддаць даніну памяці героям, якія змагаліся і працавалі для вызвалення нашай краіны. Наш абавязак — помніць гераічныя традыцыі мінулага. І нельга забываць, што незалежнасць Беларусі кавалася ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Таму вечнай будзе наша ўдзячнасць усім жывым і загінулым героям. Вельмі кранальным напамінам пра гэта на мерапрыемстве сталі выкананне прысутнымі гімна і хвіліна маўчання. Сярод прысутных былі курсанты Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў, навучэнцы Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя А. К. Глебава, піянеры, актыў Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, выхаванцы сталічных патрыятычных класаў.

— Сёлета наша краіна жыве ў чаканні вялікага свята — 80-годдзя Вялікай Перамогі. Падзеям той вайны будуць прысвечаны і ўсе мерапрыемствы, якія запланаваны ў нас на трэцім этапе акцыі «Разам з мастацтвам», — расказаў **дырэктар Маладзёжнага тэатра эстрады, дэпутат Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Сяргей МЯДЗВЕДЗЕЎ.** — Запланавана наведванне 18 населеных пунктаў у розных кутках Беларусі, дзе артысты нашага тэатра і іншыя вядомыя выканаўцы, навучэнцы беларускіх спецыяльных навучальных устаноў сустрэнуцца з маладымі людзьмі для важных размоў. Асаблівасць нашай акцыі — жывыя дыялогі, дзе сціраецца мяжа паміж артыстам і гледачамі, а нараджаецца цёплая, шчырая размова. Там артысты раскажуць гісторыі сваіх сем'яў, бо кожнаму ёсць што ўспомніць.

Непаўторныя эмоцыі прысутным падчас старту падарыў і момант перадачы жыхаром аграгарадка Нісімкавічы Чачэрскага раёна Аляксандрам Ганчаровым у фонд музея гісторыі ВАВ арыгіналаў лістоў бацькі-франтавіка да сваёй сям'і. У сям'і Ганчарова за родную зямлю і за вызваленне свету ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў змагаўся дзядуля Фядот з чатырма сынамі. «У гэтых салдацкіх трохвугольніках — лісты майго бацькі, якія ён пісаў бацькам, жонцы. І там сярод іншага ёсць словы «Перамога будзе за намі!» Я вырашыў перадаць іх у музей, таму што памяць пра тыя падзеі павінна жыць...» — зазначыў Аляксандр Сяргеевіч.

— Мы ведаем, як няпроста аддаваць такія пісьмы. І разумеем, што ў кожным з іх заўсёды — герой і яго лёс, таму будзем беражліва іх захоўваць, — сказаў **дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Уладзімір ВАРАПАЕЎ.** — На сёння ў нашым музеі знаходзіцца больш за 164 000 адзінак захоўвання, а калі ён адкрываўся, было толькі 10 000. Штогод наш фонд папаўняецца тысячай новых рарытэтаў. І гэтыя лісты таксама зоймуць годнае месца: мы кожны вывучым, захаваем і раскажам пра іх.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!
Камуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі
ЗВЯЗДА
ОРГАН ЦК КП(б) БЕЛАРУСІ, СНАРКОМА І ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

## ХРОНІКА Вялікай ПЕРАМОГІ

### «Звязда». № 38 — 25 лютага 1945 года

### • На фронце

Да поўнай перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі засталіся два месяцы. Нашы войскі ўсё яшчэ змагаліся за выхад з-пад гітлераўскай няволі. У Чырвонай Арміі было толькі адно жаданне: як мага хутчэй дайсці да Берліна і ўзняць над ім сцяг Перамогі. «Поўная перамога над немцамі цяпер ужо блізка. Але перамога ніколі не прыходзіць сама, — яна здабываецца ў цяжкіх баях і ва ўпорнай працы. Асуджаны вораг кідае ў бой апошнія сілы, адчайна супраціўляецца, каб пазбегнуць суровай адплаты», — пісала газета ў гэты дзень, уздымаючы баявы дух народа.

Паводле аператыўнай зводкі ад Савецкага інфармбюро, змешчанай у нумары газеты, «на працягу 24 лютага на Земландскім паўвостраве, на паўночным захадзе ад Кенігсберга, нашы войскі адбівалі атакі пяхоты і танкаў праціўніка. Адначасова на паўднёвым захадзе ад Кенігсберга яны вялі баі па знішчэнню ўсходне-прускай групіроўкі праціўніка і авалодалі населенымі пунктамі Экер, Кукенен, Лангендорф, Квішзн, Пербандэн, Шэнеберг, Раубшах, Анцікен, Швілгарбен.

На поўдні і паўднёвым захадзе ад Данцыга ў выніку наступальных баёў авалодалі населенымі пунктамі Жэранжно, Максхаузен, Вельбрандово, Осово, Замосц, Клодня, Грос-Іекцнік, Мосін, Штайнборн, Штрэтцын. У горадзе Грудзяндз (Граудэнц) прадаўжаліся баі па знішчэнню акружанага гарнізона праціўніка.

У раёне Брэслау нашы войскі, прадаўжаючы баі па знішчэнню акружанай у горадзе групіроўкі праціўніка, авалодалі прыгарадам Ольташын і занялі 15 кварталаў у паўднёвай частцы горада. На паўночным беразе Дуная, на ўсходзе ад Каморно, яны адбівалі атакі буйных сіл пяхоты і танкаў праціўніка. На другіх участках фронту — пошукі разведчыкаў і ў раёнах пунктаў баі мясцовага значэння».

За 23 лютага на ўсіх франтах, паводле звестак, было падбіта і знішчана 116 нямецкіх танкаў. У паветраных баях і агнём зенітнай артылерыі збіта 34 самалёты праціўніка. Чым бліжэй перамога, тым мацней павінны былі быць пільнасць і ўдары па ворагу.

### • У тыле

У толькі нядаўна вызваленай разбуранай Беларусі 25 лютага нашы людзі рыхтаваліся да самай мірнай справы — сяўбы. Немцы за тры гады зруйнавалі гаспадарку, спустошылі палі. Значна скарацілася пасяўная плошча, таму неабходна было прыкласці ўсе намаганні, каб дабіцца ў самы кароткі тэрмін павелічэння ўраджайнасці. Саўнаркам СССР і ЦК ВКП(б) у дакуменце, які друкаваўся ў № 38 нашай газеты, асабліва адзначалі патрыятычны ўздым калгаснікаў і іх дапамогу Чырвонай Арміі ў справе канчатковага разгрому нямецкіх захопнікаў.

«Немцы зруйнавалі нашу гаспадарку, спустошылі нашы палі. Мы павінны напоўніць глебу новымі жыўцельнымі сокамі, у тэрмін засеяць добраякасным насеннем, арганізаваць добры догляд пасеваў, каб дабіцца ў самы кароткі тэрмін павышэння ўраджайнасці да даваеннага ўзроўню».

Да пачатку веснавых работ, пісала «Звязда», якія ў многім вырашаюць поспех усяго сельскагаспадарчага года, засталося не так многа. «Для перамогі над ворагам патрэбна не толькі добрае ўзбраенне, але і прадавольства». На старонках газеты размясцілі матэрыял з парадамі, як вырошчваць бульбу парасткамі. Гэты метад важны таму, што за час «гаспадарання» нямецка-фашысцкіх акупантаў у Беларусі засталося вельмі мала чыста сартавой бульбы. «Перад намі стаіць задача на працягу 1-2 года ствараць чыстасартавой фонд насеннай бульбы, у асаблівасці ракаўстойлівых сартоў. Паспяхова вырашыць гэту задачу ў многім дапаможа метад пасадкі бульбы парасткамі».

**Вядучая рубрыкі Яна ВАЛАСАЧ.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

**Организатор электронных торгов: Голоцкий сельский исполнительный комитет**, Минский область, Пуховичский район**, аг. Голоцк, ул. Центральная, 11,** тел.: (801713) 68589, 68636, 68799.
**Оператор электронной торговой площадки:** открытое акционерное общество «Белорусская универсальная товарная биржа».
**Электронный адрес электронной торговой площадки:** www.et.butb.by.
**Дата проведения электронных торгов: 31 марта 2025 г.**
**Время проведения электронных торгов устанавливается** ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество»

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер; целевое назначение земельного участка; вид права | Площадь земельного участка, *га* | Инженерная инфраструктура (возможность подключения) | Начальная цена, *руб.* | Задаток, *руб.* | Расходы по подготовке, *руб.* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Минская область, Пуховичский р-н, д. Моторово, ул. Советская, 98Б | 624482503101000541; строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома; частная собственность | 0,114 | Сети электроснабжения, газоснабжения; водоснабжение | 10123,20 | 1012,32 | 3474,82 |
| 2 | Минская область, Пуховичский р-н, д. Хозянинки, ул. В. Мысливца, 26 | 62448256101000225; строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома; частная собственность | 0,1422 | Сети электроснабжения, газоснабжения; водоснабжение | 10053,54 | 1005,35 | 2631,68 |

**Задаток для участия в электронных торгах перечисляется** на расчетный счет № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код банка AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

**Срок внесения задатка –** до подачи заявления на участие в электронных торгах. **Назначение платежа:** внесение суммы задатка на участие в торгах. **Окончание приема заявлений на участие в электронных торгах** с прилагаемыми к ним документами – **26 марта 2025 г. до 15.00.**

Лицо, желающее принять участие в электронных торгах в отношении нескольких предметов электронных торгов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов торгов. Оплата стоимости предметов торгов осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время либо с участием представителя организатора в рабочее время (понедельник–пятница, 8.30–13.00, 14.00–17.30).

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением «О порядке проведения электронных торгах по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, в частную собственность», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608, и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» от 29.12.2015 №143.

В течение десяти рабочих дней после утверждения протокола победитель электронных торгов (претендент на покупку) обязан:

- возместить расходы по подготовке, в том числе связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого земельного участка;

- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка;

- внести плату за земельный участок, продаваемый в частную собственность.

После совершения победителем электронных торгов (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее двух рабочих дней, исполнительный комитет передает ему выписку из решения об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и один экземпляр протокола.

Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов подлежат возмещению в порядке, предусмотренном в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь 1 апреля 2014 г. № 298 «Об утверждении положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку»

ВЕСТКІ З МЕСЦАЎ

# «ЖЫЦЦЁ — НЕ ТЫЯ ДНІ, ЯКІЯ ПРАЙШЛІ,

## а тыя, што запомніліся»

**...Мы, жыхары аграгарадкоў Грынкі і Нязбодзічы Свіслацкага раёна, падарожнічалі і раней, а год таму стварылі адмысловы клуб: «Вецер вандраванняў» «падхапіў» не столькі моладзь, колькі людзей пажылых: многія з іх на заслужаным адпачынку, многія працуюць.**



Марыя Чаславаўна Захарка, якая разам з мужам аб'ехала ўвесь былы Савецкі Саюз, прывяла ў клуб сваіх сябровак Галіну Уладзіміраўну Грушэўскую, Тамару Аляксандраўну Місюлю, Вольгу Емяльянаўну Забалоцкую, Ніну Станіславаўну Лінкевіч. Ніводную вандроўку не прапускае Надзея Мікалаеўна Карпюк, а разам з ёй у дарозе Ала Міхайлаўна Пажарыцкая і Ларыса Паўлаўна Гваздзялюк. У рабоце клуба з задавальненнем удзельнічаюць жыхары аграгарадкоў Вердамічы, Дабраволя, Вялікае Сяло.

Летась мы пабывалі на шклозаводзе «Нёман» у Бярозаўцы, у Лідскім замку, у доме-музеі Адама Міцкевіча ў Навагрудку, на возеры Літоўка з цікавай сядзібай у стылі фэнтэзі. Вельмі спадабаўся старажытны Слонім і свята «Рыбны дзень» на возеры Свянціца...

Не так даўно зноў вярнуліся з вандроўкі: у Кобрыне цікава было пабываць на фабрыцы «Палессе» (уразіла, што яна пастаўляе дзіцячыя цацкі ў 32 краіны свету!), наведаць Дом-музей А. В. Суворава, прайсціся па гарадскім парку, дзе шмат жывых вавёрак і цікавых скульптур, і нарэшце цудоўна адпачыць у мясцовым аквапарку.

Пра свае вандроўкі мы з ахвотай распавядаем у сацсетках. Таму з намі можна вандраваць нават седзячы на канапе, але...

Напэўна, усім вядома, што жыццё — гэта не тыя дні, якія прайшлі, а тыя, што запомніліся. Хочацца, каб іх, вось такіх, было як мага больш: мы вельмі ўдзячны адміністрацыі мясцовай гаспадаркі «ВМК-АГРА» за падтрымку нашай ідэі і выдзяленне транспарту для вандровак.

**Марыя Самалевіч,**
**кіраўнік клуба,**
*аг. Грынкі, Свіслацкі раён.*

# МОЖА І СЫН ГЕРОЕМ СТАЦЬ...

**Павел Іларыёнавіч Голубеў быў камандзірам артылерыі партызанскай брыгады імя Сталіна, жонка яго, Вера Ільінічна, — радавой партызанкай. Ім, абодвум, пашчасціла здабыць Перамогу і застацца жывымі... Не дзіва, што менавіта партрэтамі бацькоў адкрывалася выстаўка карцін іх сына.**

Віктар Паўлавіч — чалавек вельмі сціплы: мастаком сябе не лічыў і не лічыць. Нарадзіўся ў 1938-м — дзяцінства адняла вайна. Пасля заканчэння васьмі класаў, Клайпедскай мараходкі і Ленінградскага вышэйшага ваенна-марскога вучылішча хадзіў па Балтыйскім і Каспійскім морах, Індыйскім акіяне, працаваў на Паўночнай Атлантыцы. Там, прызнаецца, не да творчасці было... Да малявання, якім захапляўся яшчэ ў школе, Віктар Паўлавіч вярнуўся хіба пасля службы.

...Пра многае могуць расказаць карціны мастака. А галоўнае, што яны здольныя аб'ядноўваць: Віктар Паўлавіч часта наведвае літаратурныя вечарыны народнага калектыву «Натхненне», з радасцю дорыць удзельнікам свае работы. Не дзіва, што яны таксама адгукнуліся: можна сказаць, аздобілі карціны (а сярод іх і адмысловыя копіі вядомых палотнаў) вершаванымі творамі.

На сустрэчу, на адкрыццё выставы ў наш цэнтр культуры і народнай творчасці Віктар Паўлавіч прыйшоў разам са сваёй вернай спадарожніцай Людмілай Іванаўнай у строгім, але ж цывільным касцюме. Ваенную форму капітана другога рангу адзявае (яго словы: «як і належыць афіцэру») двойчы на год — 23 лютага і 9 Мая.

**Аляксандр Матошка,**
*г. Расоны.*


# ИЗМЕНЕНИЯ № 3 В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

## по объекту «Многоквартирный жилой дом со встроено-пристроенными помещениями по пр-ту Дзержинского», *опубликованную в газете «Звязда» от 30.01.2024 г. № 20 (30154)*

### Сведения о застройщике

**Застройщик:** общество с ограниченной ответственностью «ТАПАС» зарегистрировано Мингорисполкомом в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 27.07.2001 за № 101484246.

**Юридический адрес и местонахождение предприятия:** 220114, г. Минск, пр-т Независимости, д. 173, пом. 215-4, тел./факс: (017) 302 84 10/15.

**Офис продаж:** г. Минск, пр-т Независимости, 173, 2-й этаж, офис 210, тел. +375 (29) 340 05 40.

**Режим работы офиса продаж:** понедельник – четверг: с 9.00 до 18.00, пятница: с 9.00 до 16.45.

Сведения о жилых домах и иных объектах недвижимости, в строительстве которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих опубликованию проектной декларации, с указанием информации о фактических сроках строительства данных объектов:

- жилой дом № 123 по пр-ту Дзержинского в г. Минске – 64 мес.;
- жилой дом № 45 по ул. Ржавецкой в г. Минске – 23 мес.;
- жилой дом № 47 по ул. Ржавецкой в г. Минске – 27 мес.;
- жилой дом № 49 по ул. Ржавецкой в г. Минске – 25 мес.;
- одноквартирные жилые дома №№ 4, 6, 6А, 8, 8А, 10, 10А, 12, 12А, 14, 14А, 16, 16А по ул. Ратомской – 19 мес.;
- жилые дома №№ 18, 20 по ул. Ратомской – 23 мес.

### Информация об объекте строительства

**Цель строительства –** строительство объекта «Многоквартирный жилой дом со встроено-пристроенными помещениями по пр-ту Дзержинского».

Срок начала строительства объекта – 09 августа 2018 года. Предполагаемый срок завершения застройщиком строительства объекта и ввода его в эксплуатацию – 1-й квартал 2025 года.

**Строительство осуществляется на основании:**

- решений Минского городского исполнительного комитета от 07.06.2018 г. № 1866 и от 30.09.2021 г. № 2926;
- проектно-сметной документации, прошедшей в установленном порядке государственную экспертизу (заключения РУП «Главгосстройэкспертиза» № 76-15/18 от 22.03.2018 г., № 164-15/19 от 24.05.2019 г., № 71-15/22 от 24.03.2022 г., № 71-15/22-Д1 от 31.03.2022 г., № 71-15/22-Д2 от 15.06.2022 г., № 146-15/23 от 06.04.2023 г.;
- свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации земельного участка и прав на него № 500/249-13446 от 17.05.2023;
- договора строительного подряда на строительство объекта № 1М-ГП от 30.03.2022 г., заключенного с ООО «ТАПАС ПЛЮС»;
- извещения о получении уведомления и регистрации объекта строительства, выданного Инспекцией Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску от 09.08.2018 № 2-203Ж-031/18.

### Сведения об объекте строительства

Земельный участок для строительства объекта расположен в Московском районе г. Минска в границах: с северо-запада – улицей Розы Люксембург и ранее сложившейся жилой застройкой средней этажности, с юго-востока – проспектом Дзержинского с расположенным вдоль проспекта отелем «Ренессанс Минск», а также бизнес-центром. Земельный участок общей площадью 0,4945 га предоставлен застройщику во временное пользование для строительства и обслуживания объекта «Многоквартирный жилой дом со встроено-пристроенными помещениями по пр-ту Дзержинского».

Объект представляет собой многоквартирный жилой дом комфортной категории проживания со встроено-пристроенными помещениями и гаражом-стоянкой закрытого типа. Жилой дом совместно со встроенными помещениями и гаражом-стоянкой образует единый 23-этажный комплекс, с техническим чердаком и цокольным надземным этажом. Высота здания – 74,2 м. Здание состоит из разноэтажных объемов, в которых размещены различные по функциональным группам помещения:

- основной (высотный) 23-этажный объем в осях 1-7, А-Ж с размерами в плане по крайним осям 21,25 х 22,7 м. В нем размещена жилая часть и медицинский центр;
- к основному объему пристроена неотапливаемая гараж-стоянка закрытого типа, решенная в два уровня с раздельными въездами-выездами. В пристроенной части также размещены офисные помещения и расчетно-кассовый центр. Объем имеет сложную в плане форму габаритами в крайних осях 1/1-16/1 и А/1-С/1 68,7х47,6 м;
- смежно с гаражом-стоянкой размещены два отдельных здания: трансформаторная подстанция и повысительная насосная станция;
- кровля пристроенной части – эксплуатируемая, плоская совмещенная, с внутренним водостоком, решена в несколько уровней с переходными лестницами;
- кровля высотной части – плоская совмещенная, неэксплуатируемая, с внутренним водостоком.

Конструктивная схема здания **жилого дома** – монолитный железобетонный рамно-связевый каркас. Наружные ограждающие стеновые конструкции – вентфасад из алюминиевых кассет на подсистеме стальных профилей с остеклением и заполнением глухих участков минераловатными плитами, участки наружных стен – монолитные железобетонные. Внутренние стены – монолитные железобетонные. Перегородки – из блоков керамзитобетона толщиной 100 мм. Оконные проемы, остекление лоджий — структурное остекление с заполнением стеклопакетами. На лоджиях предусмотрено не менее 50 % открывающихся створок. Открывающиеся створки окон оборудованы детскими замками безопасности. Заполнение глухой подоконной части остекления принято высотой не менее 1,1 м из многослойного безопасного стекла. Двери из алюминиевого профиля, стальные.

Принятая высота этажей в отметках чистого пола:
- цокольный этаж – (перемен) 2,66…4,95 м;
- 1-й этаж – (перемен) 2,4…4,1 м;
- жилые этажи 2–19 – 2,85 м;
- жилые этажи 20–23 – 3,3 м;
- технический чердак – 2,35; 3,7 м (в чистоте).

Всего квартир в доме – 96, в том числе: 1-комнатных – 41, 2-комнатных – 42, 3-комнатных – 13.

В здании запроектированы 3 лифта грузоподъемностью 1000 кг.

**Гараж-стоянка** запроектирован в два уровня закрытого типа на 111 машино-мест. Въезды (выезды) организованы по прямолинейным двухпутным рампам. На каждом уровне предусмотрено устройство зарядных станций для электромобилей и машино-мест для транспорта маломобильных лиц. При постановке автомобилей перпендикулярно ограждающим конструкциям и вдоль рамп предусмотрено устройство колесоотбойников. Полы запроектированы с уклоном к водоотводящим устройствам. На въездах предусмотрена установка ворот.

Наружная отделка:
- стены – вентфасад с облицовкой алюминиевыми кассетами; витражное остекление; сэндвич-панели; легкая штукатурная система; ламели.

Внутренняя отделка помещений общего пользования: стены – декоративная штукатурка, потолки – покраска, подвесные потолки; покрытие пола – керамическая плитка.

В квартирах и встроенных помещениях предусмотрена подготовка под отделку (полы со звукоизоляцией и цементно-песчаной стяжкой, стены – улучшенная штукатурка; потолки – заделка швов, выравнивание поверхности).

Объект оборудуется всеми необходимыми инженерными системами и оборудованием согласно проектной документации: предусматриваются отдельные системы отопления для жилых помещений и для встроенных помещений. В жилом доме предусматриваются отдельные ветки систем отопления для мест общего пользования, лестничных клеток, технических помещений на отм. -2,680. В качестве отопительных приборов предусматриваются: низкопольные конвекторы с нижним подключением для жилых помещений, стальные панельные радиаторы для остальных помещений. Для жилых помещений проектом предусматривается приточно-вытяжная вентиляция с естественным и механическим побуждением движения воздуха. В жилом доме запроектированы следующие системы внутреннего водоснабжения и канализации: отдельные зонные системы внутреннего хозяйственно-питьевого холодного и горячего водоснабжения (1 зона – 1-6-й этажи; 2 зона – 7-23-й этажи), отдельная система противопожарного – водопровода – (система – АПТ), отдельные – системы хозяйственно-питьевого холодного и горячего водоснабжения встроенных помещений; системы бытовой канализации и внутренних водостоков; дренажная система (от кондиционеров).

В жилом доме отсутствуют жилые помещения, при заключении договоров по которым должно отдаваться гражданам, состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий.

В состав общего имущества объекта входят водомерный узел, ИТП, электрощитовая, коридоры общего пользования, лестницы, лестничные клетки, лифты, лифтовые и иные шахты, кровля, другие места общего пользования, ограждающие несущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование общедомового назначения, находящееся за пределами или внутри жилых помещений, иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, помещение товарищества собственников, элементы озеленения и благоустройства дворовой и прилегающей к жилому дому территории.

Застройщик передает общее имущество совместного домовладения после приемки в эксплуатацию представителю товарищества собственников, а если на момент приемки в эксплуатацию объекта товарищество собственников не будет создано – лицу, определяемому общим собранием дольщиков или уполномоченному местным исполнительным и распорядительным органом.

**Комплексное благоустройство территории** включает в себя устройство проездов и парковок, пешеходных тротуаров и дорожек, устройство детских и спортивных площадок, оборудование территории малыми архитектурными формами, устройство хозяйственной площадки для ТКО, озеленение территории.

Финансирование элементов благоустройства территории производится участниками строительства жилого дома.

Для заключения договоров создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц предлагаются:

1) 1 квартира, расположенная на 22-м этаже жилого дома, в том числе:
- двухкомнатная квартира общей площадью 95,60 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 9200 белорусских рублей;

2) 2 квартиры, расположенные на 23-м этаже жилого дома, в том числе:
- двухкомнатная квартира общей площадью 95,60 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 9700 белорусских рублей;
- трехкомнатная квартира общей площадью 116,72 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 9700 белорусских рублей;

3) 7 машино-мест в гараже-стоянке жилого дома. Стоимость строительства машино-места составляет 60 000 белорусских рублей;

4) 7 машино-мест в гараже-стоянке жилого дома с электрической зарядной станцией. Стоимость строительства машино-места составляет 100 000 белорусских рублей;

5) 41 машино-место в гараже-стоянке жилого дома. Стоимость строительства машино-места составляет 40 000 белорусских рублей;

6) 2 административных помещения, в том числе:
- медицинский центр общей площадью 323,70 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади расчетно-кассового центра составляет 8200 белорусских рублей;
- помещение офисов общей площадью 309,76 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади помещения офисов составляет 7500 белорусских рублей.

У застройщика действует система регулирования стоимости в зависимости от площади, этажа и условий оплаты строящегося жилого помещения и иных факторов, влияющих на стоимость.

По соглашению сторон дольщику может быть предоставлена скидка от общей стоимости объекта долевого строительства.

### Условия оплаты

Оплата цены объекта долевого строительства производится дольщиком единовременно (в течение 5 (пяти) календарных дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме) либо в установленный договором период по графику платежей.

**Для подачи заявления и заключения договора необходимы:**

- для физического лица: личное присутствие лица, с которым будет заключаться договор с паспортом или его представителя. Документы представителя – паспорт, доверенность, оформленная в установленном законодательством порядке, копия паспорта, копия доверенности;
- для юридического лица: личное присутствие руководителя юридического лица, с которым будет заключаться договор или его представителя. Документы – копия свидетельства о государственной регистрации юридического лица, копия Устава юридического лица, документ, подтверждающий полномочия на представление интересов.

Документы для заключения договоров будут приниматься с 06.03.2025 г. по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 173, 2-й этаж, офис продаж. Время работы: понедельник–четверг с 9.00 до 18.00, пятница с 9.00 до 16.45, без обеда. Суббота, воскресенье – выходной.

Подробные сведения об объекте долевого строительства, а также о планировках квартир и ходе строительства можно получить в офисе продаж по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 173, 2-й этаж.

Тел. +375 29 3400540

# КРЭДЫТ ПА НОВЫХ ПРАВІЛАХ

## ІНФАРМАЦЫЯ ПА ЎСІХ СТАДЫЯХ

Для абароны правоў і законных інтарэсаў кліентаў, у прыватнасці, прадугледжаны наступныя меры. Гэтым дакументам устаноўлены патрабаванні да парадку інфармавання спажыўцоў банкаўскіх прадуктаў на ўсіх стадыях крэдытных адносін: да заключэння дагавора спажывецкага крэдыту, у працэсе яго выканання і пасля выканання пазычальнікам сваіх абавязацельстваў.

Цяпер інфармацыя аб спажывецкім крэдытаванні павінна быць абавязкова размешчана на сайце банка, а таксама ў месцах прадастаўлення спажывецкага крэдыту. Прычым да заключэння дагавора крэдыту заяўніку павінна быць прадастаўлена інфармацыя аб умовах крэдытавання ў выглядзе табліцы. Калі яна прадастаўляецца на паперы, то памер такой табліцы не павінен перавышаць аднаго ліста.



**Артыкулам 10** гэтага закона ўстаноўлена патрабаванне аб неабходнасці ацэнкі плацежаздольнасці пазычальніка перад заключэннем і змяненнем дагавора спажывецкага крэдыту. Такая ацэнка ажыццяўляецца з ужываннем паказчыка пазыковай нагрузкі і паказчыка забяспечанасці крэдыту. Пры прыняцці рашэння аб прадастаўленні спажывецкага крэдыту з перавышэннем названых паказчыкаў заяўнік павінен быць апавешчаны аб гэтым. У цяперашні час значэнне паказчыка пазыковай нагрузкі і паказчыка забяспечанасці крэдыту складае 40 % і 90 % адпаведна.

## НОВЫ ГРАФІК ПЛАЦЯЖОЎ

Што мы мелі да гэтага? Пры змене графіка плацяжоў, пры датэрміновым вяртанні альбо пры пратэрмінаванай запазычанасці па крэдыце банкі (не ўсе) за кожнае падобнае дзеянне выстаўлялі рахунак кліентам. За кожную паперку раней неабходна было плаціць. У кожнай фінансавай арганізацыі былі свае расцэнкі за складанне гэтых даведак. Што мы маем цяпер?

**Артыкулам 17** закона вызначаецца патрабаванне аб прадастаўленні графіка плацяжоў па дагаворы спажывецкага крэдыту ў выпадку, калі такія плацяжы з'яўляюцца няроўнымі і сума штомесячнага плацяжу не паказана ў дагаворы, а таксама па дагаворы спажывецкай мікрапазыцы, у адпаведнасці з якім спажывецкая мікрапазыка прадастаўляецца на тэрмін больш за адзін год.

Пры датэрміновым вяртанні (пагашэнні) спажывецкага крэдыту, а таксама змяненні ўмоў дагавора, якія пацягнуць змяненне памеру і тэрмінаў плацяжу, крэдытаатрымальніку цяпер павінен быць бясплатна прадастаўлены абноўлены графік плацяжоў. Акрамя таго, пазычальнік мае права атрымліваць звесткі аб запазычанасці па дагаворы не радзей за адзін раз у месяц бясплатна.

Калі ўтварылася такая запазычанасць па дагаворы спажывецкай мікрапазыцы, якія забяспечаны залогам рухомай маёмасці, паручыцельствам, пазычальнік павінен быць апавешчаны аб гэтым у тэрмін не пазней за 20 дзён з дня самой запазычанасці. Калі пазычальнікам ва ўказаны тэрмін не вернута запазычанасць па дагаворы, адпаведнае апавяшчэнне павінна быць накіравана паручыцелю (іншай асобе, якая прадаставіла забеспячэнне) у тэрмін не пазней 25 дзён з дня такой запазычанасці.

У выпадку ўзнікнення пратэрмінаванай запазычанасці па дагаворы крэдыту крэдытаатрымальнік павінен быць апавешчаны пра гэта ў тэрмін не пазней за 30 дзён з дня ўтварэння такой запазычанасці. У выпадку калі па дагаворы крэдыту прадастаўлена забеспячэнне выканання абавязацельстваў і крэдытаатрымальнікам ва ўказаны тэрмін не вернута пратэрмінаваная запазычанасць, адпаведнае апавяшчэнне павінна быць накіравана паручыцелю (іншай асобе, якая прадаставіла забеспячэнне) у тэрмін не пазней за 60 дзён з дня такой запазычанасці. І такое апавяшчэнне ажыццяўляецца без збірання ўзнагароджання з грамадзян.

Яшчэ пра даведкі. Пасля пагашэння крэдыту або мікрапазыкі кліент можа запатрабаваць даведку аб поўным выкананні абавязацельстваў, якая павінна быць прадастаўлена банкам (мікрафінансавай арганізацыяй) бясплатна. У цяперашні час гэтыя нормы дзейнічаюць толькі ў дачыненні да крэдытаў.

## ІСТОТНЫЯ ЎМОВЫ І АСАБЛІВАСЦІ ДАГАВОРАЎ

Законам, у прыватнасці, замацавана, што спажывецкі крэдыт прадастаўляецца ў беларускіх рублях. Уключэнне ў дагавор умовы аб аплаце грашовых абавязацельстваў у рублях у суме, эквівалентнай пэўнай суме ў замежнай валюце або ўмоўных грашовых адзінках, не дапускаецца.

**Артыкулам 13** закона паведамляецца, што банкі могуць заключаць дагаворы спажывецкага крэдыту, якія складаюцца з агульных і індывідуальных умоў. Агульныя ўмовы дагавора размяшчаюцца на інтэрнэт-сайце банка з забеспячэннем доступу кліента да ўсіх змяненняў, якія ўносяцца. Індывідуальныя ўмовы дагавора — сума, тэрмін, парадак прадастаўлення і вяртання крэдыту, працэнтная стаўка, меры адказнасці — датычацца канкрэтнага кліента і вызначаюцца пры заключэнні крэдытнага дагавора. Такі падыход дазволіць скараціць аб'ём дагавора і дасць магчымасць крэдытаатрымальніку больш дасканала вывучыць умовы дагавора, асабліва тыя, якія датычацца аб'ёму грашовых абавязацельстваў і моманту, калі яны павінны быць выкананы.

**У артыкуле 11** закона вызначаны пералік паслуг, за якія плаціць не трэба. **А артыкулам 14** закона вызначаны асаблівасці прадастаўлення абавязковых платных паслуг і тых паслуг, якія могуць быць аказаны толькі са згоды кліента.

Абавязковыя паслугі звязаны з прадастаўленнем спажывецкага крэдыту і ацэнкай забеспячэння (напрыклад, страхаванне закладзенай маёмасці і ацэнка закладу).

Сёння ад дадатковых платных паслуг заяўнік можа адмовіцца. На атрыманне такіх паслуг павінна быць атрымана згода заяўніка. Пры гэтым адмова альбо згода на атрыманне дадатковых платных паслуг павінна быць афармлена адпаведным чынам і не можа выяўляцца ў вуснай форме.

У адпаведнасці з артыкулам 19 закона крэдытаатрымальнік цяпер мае права датэрмінова вярнуць спажывецкі крэдыт (мікрапазыку) поўнасцю або часткова без папярэдняга паведамлення і згоды банка або мікрафінансавай арганізацыі. Пры гэтым працэнты выплачваюцца за фактычны тэрмін карыстання спажывецкім крэдытам. З пазыкай на жыллё сітуацыя трохі іншая. Крэдыты на фінансаванне нерухомасці могуць быць вернутыя спажыўцамі датэрмінова на ўмовах, якія прадугледжаны толькі крэдытным дагаворам.

## ПРАВА НА АДТЭРМІНОЎКУ

**Артыкулам 21** закона вызначаецца пералік цяжкіх жыццёвых сітуацый, пры якіх банкамі аднаразова прадастаўляецца адтэрміноўка плацяжу па дагаворы спажывецкага крэдыту.

Да такіх сітуацыяў адносяцца:

— смерць мужа (жонкі) крэдытаатрымальніка;

— страта працы пазычальнікам;

— прызнанне кліента інвалідам у адпаведнасці з заканадаўствам;

— павелічэнне колькасці асоб, якія знаходзяцца на ўтрыманні ў крэдытаатрымальніка;

— часовая непрацаздольнасць чалавека звыш сарака дзён.

Адтэрміноўка плацяжу можа быць прадастаўлена па заяве грамадзяніна на тэрмін не менш за тры месяцы, калі меншы тэрмін ім не запрошаны, з прадаўжэннем тэрміну поўнага вяртання спажывецкага крэдыту на такі ж тэрмін.

Пры гэтым дакумент не прадугледжвае абмежаванняў на права банка прыняць рашэнне аб прадастаўленні адтэрміноўкі плацяжу па дагаворы крэдыту паўторна і па іншых падставах, а таксама ў выпадках, устаноўленых заканадаўствам.

## КАБ НЕ ТРАПІЦЬ У «ПАСТКУ»

Законам замацаваны гранічны памер сумы працэнтаў па дагаворы спажывецкай мікрапазыкі, а таксама ўстаноўлена абмежаванне агульнай сумы няўстойкі (штрафу, пеняў), працэнтаў за карыстанне чужымі грашовымі сродкамі ў выпадку невыканання дагавора такога крэдыту або дагавора закладу. Цяпер пры афармленні крэдыту кліент ужо загадзя будзе ведаць, якую максімальную суму ён можа заплаціць па крэдыце, калі раптам будзе разлічвацца з банкам несвоечасова. Гэтыя максімальныя сумы будуць непрыемнымі, але не рабаўніцкімі.

Сума працэнтаў па спажывецкай мікрапазыцы залежыць ад тэрміну яе вяртання і не можа перавышаць: — па мікрапазыках да года — сумы спажывецкай мікрапазыкі; — па мікрапазыках звыш года — яго двухразовай сумы. Агульная сума няўстойкі (штрафу, пеняў) не можа перавышаць палову сумы спажывецкай мікрапазыкі, прадастаўленай пазыкоўцам.

**Сяргей КУРКАЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*


**ДОПОЛНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ООО «СМУ-87»,**

*опубликованной в газете «Звязда» 11.02.2025 г.*

**по объекту «Возведение жилой застройки по ул. Мястровская в м-не Лебяжий г. Минск»**

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, в жилом доме № 1 по г/п с пристроенным двухэтажным гаражом-стоянкой предлагаются:

**5 (пять)** однокомнатных квартир **площадью от 28 до 39 кв. м включительно,** стоимость 1 кв. метра **от 6 376 до 6 859 белорусских рублей;**

**3 (три)** однокомнатные квартиры **площадью от 40 до 49 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 6 215 до 6 698 белорусских рублей;**

**2 (две)** двухкомнатные квартиры **площадью от 51 до 61 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 5 989 до 6 376 белорусских рублей;**

**2 (две)** двухкомнатные квартиры **площадью от 76 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 5 893 до 6 054 белорусских рублей;**

**2 (две)** двухкомнатные квартиры **площадью от 84 до 97 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 5 571 до 5 732 белорусских рублей.**

На предприятии действует система регулирования стоимости, зависимая от площади, этажа и условий оплаты строящегося объекта.

Оплата производится в белорусских рублях. Указанные цены действуют до момента опубликования новой проектной декларации, дополнения или изменения к ней и при условии наличия квартир, предложенных для заключения по договорам создания объектов долевого строительства.

**Условия оплаты квартиры** – полная оплата цены договора в течение 3-7 календарных дней от даты следующей за днем регистрации договора долевого строительства в Комитете строительства и инвестиций Мингорисполкома.

Ознакомиться с планировками квартир можно по предварительной записи в офисе продаж «Гранд Кристал» по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, пом. 1567 по графику пн–пт с 9.00 до 18.00, сб, вс – выходной, тел. 375 (44) 711-33-00.

Прием заявлений на заключение договоров создания объектов долевого строительства будет осуществляться с 9.00 27.02.2025 г. в порядке живой очереди в офисе продаж «Гранд Кристал» по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, пом. 1567.

УНП 193672656



***УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ***
***ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш»***

**27 марта 2025 года**
**состоится годовое общее собрание акционеров ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш»**

Место проведения: г. Лида, ул. Советская, д. 70 (конференц-зал).

**Повестка дня собрания**

**Вопрос 1.** Отчет генерального директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2024 год. Утверждение ключевых показателей эффективности на 2025 год.

**Вопрос 2.** Отчет наблюдательного совета о проделанной работе в 2024 году.

**Вопрос 3.** О результатах аудита и проверки ревизионной комиссией финансовой и хозяйственной деятельности общества за 2024 год.

**Вопрос 4.** Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности общества за 2024 год.

Вопрос 5. Об утверждении распределения и использования чистой прибыли (убытков) за 2024 год. О выплате дивидендов за 2024 год.

**Вопрос 6.** Утверждение направлений распределения прибыли общества на 2025 год.

**Вопрос 7.** Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества, утверждении их составов.

**Вопрос 8.** Утверждение размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Начало работы собрания в 11.00.
Регистрация участников собрания с 10.30 до 10.50.

***Наблюдательный совет***
***ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш».***

УНП 500021638



***Уважаемые акционеры ОАО «Стройтрест № 35»***

**27 марта 2025 года в 15.00**
**состоится общее годовое собрание акционеров**
**ОАО «Стройтрест № 35»**

**Собрание пройдет по адресу:**
**г. Минск ул. Я. Коласа, 38, четвертый этаж, актовый зал.**

**Повестка дня собрания**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2024 год и основных направлениях деятельности на 2025 год.
2. О работе наблюдательного совета Общества в 2024 году.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2024 год.
4. Об утверждении годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2024 год.
5. Об утверждении порядка использования прибыли, остающейся в распоряжении Общества за 2024 год. О выплате дивидендов за 2024 год.
6. Об утверждении плана распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества, на 2025 год и первый квартал 2026 года. Периодичность выплаты дивидендов в 2025 году.
7. О внесении изменений в Устав.
8. О внесении изменений в локальные правовые акты Общества.
9. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
10. О вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Я. Коласа, 38 в кабинете заместителя председателя Наблюдательного совета с 7 марта по 26 марта 2025 г. в рабочие дни с 9.00 до 17.00.

Регистрация участников собрания с 13.00 до 14.45 по месту проведения собрания.

Список акционеров для участия в собрании по состоянию реестра на 12 марта 2025 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 100289278

белагропромбанк
традиции будущего

**Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» сообщает, что 26 марта 2025 года**
*в соответствии с решением наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк» от 20 февраля 2025 года, протокол № 4,*

**ПРОВОДИТСЯ ГОДОВОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ОЧНОЙ ФОРМЕ**

Место нахождения общества и место проведения собрания:
**220036, г. Минск, проспект Жукова, 3.**

**Повестка дня**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Белагропромбанк» за 2024 год и задачах на 2025 год.
2. О заключении ревизионной комиссии ОАО «Белагропромбанк» по результатам проведения ежегодной ревизии финансовой и хозяйственной деятельности ОАО «Белагропромбанк» за 2024 год.
3. Об утверждении годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности ОАО «Белагропромбанк» за 2024 год.
4. О распределении прибыли ОАО «Белагропромбанк» за 2024 год и нормативах распределения прибыли в 2025 году.
5. О работе наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк» в 2024 году.
6. Об избрании членов наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк».
7. Об избрании членов ревизионной комиссии ОАО «Белагропромбанк».
8. Об утверждении состава счетной комиссии ОАО «Белагропромбанк».

Время начала проведения собрания – 15.00 часов.

Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, составляется на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного по состоянию на 24 февраля 2025 года.

Лица, имеющие право на участие в общем собрании, могут ознакомиться с перечнем информации (документов) при подготовке к проведению собрания по адресу: г. Минск, пр-т Жукова, 3 следующим образом:

при регистрации лиц, имеющих право на участие в собрании, им предоставляются для ознакомления следующие документы:

информация о деятельности ОАО «Белагропромбанк» за 2024 год, указанная в пункте 3 настоящего решения;

информационный бюллетень о показателях работы ОАО «Белагропромбанк» за 2024 год;

годовая индивидуальная бухгалтерская (финансовая) отчетность ОАО «Белагропромбанк» за 2024 год в составе: бухгалтерский баланс; отчет о прибылях и убытках; отчет об изменении собственного капитала; отчет о движении денежных средств;

аудиторское заключение по результатам проведения аудита годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности за 2024 год;

заключение ревизионной комиссии ОАО «Белагропромбанк» по результатам проведения ежегодной ревизии финансовой и хозяйственной деятельности ОАО «Белагропромбанк» за 2024 год;

проекты решений собрания;

заключение о результатах внутренней оценки эффективности деятельности правления и корпоративного управления ОАО «Белагропромбанк»;

сведения о кандидатах, выдвигаемых в наблюдательный совет и ревизионную комиссию ОАО «Белагропромбанк».

Регистрация лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, будет проводиться по месту проведения собрания 26 марта 2025 г. с 13.45 до 14.45 часов при предъявлении документов, подтверждающих их личность и полномочия.

**Телефоны для справок: 8 (017) 229 64 10 или 229 64 20.**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь № 2 от 17 января 2024 г. УНП 100693551.*

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор аукциона)
по поручению **ОАО «Веста-Борисов»** (продавец)
проводит открытый аукцион по продаже

**административного здания с инв. № 610/С-50937**

**общей площадью 846 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 620850100010001757 площадью 0,1224 га (право постоянного пользования), по адресу: Минская область, г. Борисов, ул. Почтовая, 50.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 342 000,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены **– 34 200,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона.

Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 4 (четырех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 14.01.2025.

Аукцион состоится **10.03.2025** в **15.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **07.03.2025** до **17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 136-31-11, 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: 8 (0177) 74-44-65, 8 (029) 680-16-43.**

УНН 600012029

ВАЖНА ВЕДАЦЬ

# ВІРУС НЕ ПРОЙДЗЕ!

## Чаму прышчэпкі ігнараваць не трэба?



**Эпідэмічная сітуацыя ў нашай краіне па захваральнасці на вострыя рэспіраторныя інфекцыі адпавядае бягучаму перыяду года. На сёння яна на 20 % ніжэйшая за эпідэмічны ўзровень уздыму захворвання. Пры гэтым у краіне працягваюць цыркуляваць як вірусы грыпу, так і негрыпозныя ўзбуджальнікі ВРВІ, у тым ліку каранавірусы, якія нярэдка становяцца прычынай пнеўманій.**

### ШТОГАДОВЫ ПАД'ЁМ

Як адзначыў **загадчык аддзялення імунапрафілактыкі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Кірыл ІГНАТАЎ**, паводле даных дазорнага эпідэмічнага назірання, на мінулым тыдні (з 17 да 23 лютага) захваральнасць на ВРІ была больш як на 6 % ніжэйшая, чым за такі ж перыяд 2024 года. Цяпер на тэрыторыі Беларусі цыркулююць як вірусы грыпу A($H_1N_1$) і A($H_3N_2$) і грыпу B, так і негрыпозныя вірусы.

— Такая сітуацыя з'яўляецца прагназаванай і назіраецца ў нас кожны год, калі ў перыяд з канца студзеня — пачатку лютага адбываецца штогадовы пад'ём захваральнасці на рэспіраторныя інфекцыі, — адзначыў Кірыл Ігнатаў.

### КАЛЯНДАР ВАКЦЫНАЦЫІ

Нядаўна ў Нацыянальны каляндар прафілактычных прышчэпак былі ўнесены змяненні. Новаўвядзенні звязаны з уключэннем вакцынацыі супраць пнеўмакокавай інфекцыі ўсіх дзяцей у 2, 4 і 12 месяцаў, з'явілася дадатковая прышчэпка супраць коклюшу ў 6 гадоў, а таксама прышчэпка супраць віруса папіломы чалавека (ВПЧ), якая лічыцца адным з самых надзейных спосабаў прафілактыкі раку шыйкі маткі. Апошняя прышчэпка будзе рабіцца дзяўчынкам ва ўзросце 11 гадоў.

Як паведаміў Кірыл Ігнатаў, у найбліжэйшы час ва ўстановы аховы здароўя паступіць вакцына супраць пнеўмакока, у наступным месяцы — вакцына для прафілактыкі коклюшу, дыфтэрыі і слупняку для дзяцей 6 гадоў. Вакцына супраць ВПЧ з'явіцца ў маі.

— Усе дзеці, якія сёлета па ўзросце трапляюць пад правядзенне вакцынацыі ў адпаведнасці з абноўленым нацыянальным календаром, будуць прышчэплены прэпаратамі, закупленымі за кошт рэспубліканскага бюджэту, — адзначыў урач.

Пры гэтым, як падкрэсліў Кірыл Ігнатаў, пры жаданні тыя, хто не падпадае пад вакцынацыю, згодна з Нацыянальным календаром, могуць зрабіць прышчэпку за ўласныя сродкі. У прыватнасці, прафілактыка ВПЧ актуальная для жанчын у любым узросце. Вакцына ўключае кампаненты супраць найбольш распаўсюджаных у нашай краіне анкагенных штамаў — 16-га і 18-га.

Зараз у Нацыянальным календары — прышчэпкі супраць 13 інфекцыйных хвароб. Іх пачынаюць рабіць ужо ў дзень нараджэння немаўляці — першая прышчэпка ад гепатыту В робіцца ў першыя суткі. На 3-4-я суткі дзіцяці ставяць прышчэпку ад туберкулёзу. Далей малога прышчапляюць у 2, 3 і 4 месяцы яшчэ ад шасці інфекцый: дыфтэрыі, слупняку, коклюшу, гемафільнай інфекцыі, гепатыту і поліяміэліту. У год дзіця атрымлівае прышчэпку ад адру, краснухі і эпідэмічнага паратыту. Прышчэпкі робяцца і дарослым на працягу ўсяго жыцця — як правіла, у 26, 36, 46 гадоў. Каб не прапусціць належны тэрмін, важна своечасова праходзіць дыспансерызацыю.

### ЦІ ВАРТА ЯШЧЭ ПРЫШЧАПЛЯЦЦА АД COVID-19?

Актуальная дагэтуль і прышчэпка супраць каранавіруса, які працягвае цыркуляваць у тым ліку і на тэрыторыі нашай краіны і нярэдка з'яўляецца крыніцай пнеўманій. Як растлумачыла **галоўны ўрач 6-й дзіцячай паліклінікі Мінска Ганна КОТАВА**, вірус часта муціруе, аднак вакцына, якая выкарыстоўваецца ў Беларусі цяпер (яна расійскай вытворчасці), мае часціцы віруса, якія не муціруюць. А значыць, яна ставарае імунітэт супраць любога штама COVID-19.

Пры гэтым важна памятаць, што імунітэт супраць каранавіруса і грыпу няўстойлівы, таму прышчапляцца неабходна штогод. Гэта датычыцца і людзей з хранічнымі захворваннямі. Яны якраз уваходзяць у групу рызыкі і маюць асаблівую патрэбу ва ўмацаванні імунітэту супраць гэтых інфекцый. Праўда, прышчэпка, як вядома, не засцерагае ад заражэння, затое гарантуе больш лёгкі ход хваробы і адсутнасць цяжкіх ускладненняў.

# НЯБАЧНЫ «АГЕНТ»

## Чаму можна не заўважыць прыкметы палавой інфекцыі?

**Штодзень у свеце больш за мільён чалавек заражаецца якой-небудзь інфекцыяй, што перадаецца палавым шляхам (ІППШ). Гэтыя ўзбуджальнікі могуць выклікаць звыш 30 захворванняў. Як іх своечасова заўважыць? Чаму інфекцыя можа «хавацца» ў арганізме шмат гадоў і пры чым тут прастуда і антыбіётыкі? Расказаў загадчык дэрматавенералагічнага аддзялення № 4 Мінскага гарадскога клінічнага цэнтра дэрматавенералогіі Уладзімір ЯРОМІЧ.**

### У чым небяспека?

Часцей за ўсё сустракаюцца сіфіліс, ганарэя, трыхаманоз, хламідыёз, мікаплазмоз, вірус папіломы чалавека (ВПЧ), генітальны герпес, ВІЧ. Самыя небяспечныя з іх — ВІЧ і сіфіліс.

Сярод агульных сімптомаў гэтых захворванняў, якія сустракаюцца практычна ў кожнага, хто заразіўся, — высыпанні ў вобласці геніталій (болькі, прышчыкі, эрозіі, барадаўкі), пачашчанае ці балючае мочаспусканне, павелічэнне лімфатычных вузлоў, часцей за ўсё пахвінных, непрыемныя адчуванні падчас палавога акта.

Практычна ўсе ІППШ добра і эфектыўна лечацца. Але часта гэтыя інфекцыі напачатку могуць ніяк не праяўляць сябе. Своечасова не дыягнаставанае і не пралечанае захворванне можа мець такія аддаленыя наступствы, як бясплоддзе ў мужчын, невыношванне цяжарнасці і парушэнні рэпрадуктыўнай функцыі ў жанчын.

Уладзімір Яроміч адзначыў, што для жанчын ІППШ значна больш небяспечныя, і гэта перш за ўсё звязана з жаночай фізіялогіяй:

— У жанчын прыкметы і сімптомы захворвання менш выяўленыя, можна прыняць іх за асаблівасці арганізма і не надаць ім належнага значэння. Плюс у жанчын ёсць рызыка перадачы ІППШ пры цяжарнасці і ў родах плоду. Акрамя таго, ёсць вірусы, якія ў жанчын могуць стаць прычынай развіцця раку шыйкі маткі.

### Наступствы праз гады

Сёння шматлікія бактэрыяльныя захворванні добра лечацца. З віруснымі складаней, але і тут ёсць прэпараты, якія дазваляюць змякчыць ход хваробы. Аднак здараецца, што пра інфекцыю чалавек даведваецца праз час. Напрыклад, калі падхапіў ВРВІ, і яму прызначылі кароткі курс антыбіётыкаў ці самастойна набыў іх у аптэцы без рэцэпта. У гэтым выпадку лекі могуць прыглушыць развіццё наяўнай палавой інфекцыі, і яна можа перайсці ў вялацякучую стадыю, якая праходзіць у хранічнай сцёртай форме.

— Бывае, што людзі даведваюцца аб наяўнасці гэтай інфекцыі ў арганізме праз гады, калі ўжо праяўляюцца ўскладненні і аддаленыя наступствы, — папярэдзіў урач-дэрматавенеролаг.

### Як часта трэба правярацца?

Частата здачы аналізаў залежыць ад сексуальнай актыўнасці чалавека. Камусьці дастаткова раз у год, а камусьці мае сэнс наведваць урача кожны месяц.

Для таго каб здаць аналіз на ІППШ, можна прыйсці да ўролага ці гінеколага па месцы жыхарства. У Мінску па комплекснае абследаванне можна звярнуцца ў Мінскі гарадскі клінічны цэнтр дэрматавенералогіі, у тым ліку ў кабінеты платнага ананімнага абследавання. А вось прафілактыка ІППШ простая: манагамнасць і прэзерватыў. Апошні засцерагае практычна ад усіх непажаданых наступстваў рызыкоўных сексуальных паводзін.

**Падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**

# АПЯКУНКА, МАЛІТОЎНІЦА. ЗОРКА, ПРА ЯКУЮ ЗДЫМАЮЦЬ КІНО

Па ўсёй краіне адбываюцца паказы дакументальнага фільма, прысвечанага манастыру, заснаванаму Ефрасінняй Полацкай.

Сёлета спаўняецца 900 гадоў з моманту заснавання манастыра, які мы ведаем цяпер як Спаса-Ефрасіннеўскі. Гэта значная дата для ўсёй краіны: святая лічыцца апякункай Беларусі. Чаму? Своеасаблівы адказ на гэта пытанне дае дакументальная стужка «Прыстанак святой Ефрасінні» (кінастудыі «Беларусьфільм»), прэм'ера якой адбылася ў сталічным кінатэатры «Перамога».

Складана зняць фільм, прысвечаны справам беларускай святой, і абысці ўвагай яе асобу. Таму ў аснову стужкі было пакладзена «Жыціе...» прападобнай Ефрасінні Полацкай. Бо без яе веры і імпэту не паўстаў бы дзівосны храм, створаны дойлідам Іаанам, не было б ці не самага загадкавага айчыннага сімвала — крыжа, створанага Лазарам Богшам. А яшчэ ж яна творыць цуды, нават цяпер — дапамагае тым, хто шчыра просіць яе ў малітоўных зваротах. Заснаваны прападобнай Ефрасінняй Полацкай манастыр з'яўляецца месцам, дзе штодзённа адбываюцца тысячы добрых спраў. І дзе няспынна гучыць малітва за Беларусь і наш народ.

Фільм у гонар 900-годдзя з дня заснавання Спаса-Ефрасіннеўскага стаўрапігіяльнага жаночага манастыра быў зняты па благаславенні **мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Веніяміна, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі**, які падчас прэм'еры адзначыў:

— Фільм прысвечаны найстаражытнейшаму манастыру на беларускіх землях і ва ўсходнеславянскім свеце. Манастыр, заснаваны святой, мае няпростую гісторыю, сугучную з гісторыяй нашага народа. І ў цяперашні час мы сведчым пра тое, што старажытны храм адноўлены дзякуючы намаганням дзяржавы і непасрэдна пры падтрымцы Прэзідэнта нашай краіны. Фільм — гэта цудоўная магчымасць для тых, хто не можа даехаць да манастыра, але хоча больш пра яго ведаць, пазнаёміцца са святыняй. А тым, хто ўжо пабываў у Полацку, фільм дасць глебу для разважанняў, бо ён адкрывае некаторыя невядомыя гледачу старонкі жыцця манастыра. І ў гэтым каштоўнасць падыходу. Асабліва хочацца падзякаваць за тое, што быў знойдзены поўны глыбокай пашаны падыход у перадачы гісторыі і самога зместу жыцця прыстанку ў Полацку, каб гледачы пастараліся зразумець сутнасць подзвігу прападобнай Ефрасінні, сутнасць манаскага жыцця ў сучасным свеце і высокага служэння манастыра, які ад зямлі скіроўваецца да неба.

Фактычна кожны глядач праз фільм атрымлівае своеасаблівую экскурсію па манастыры: аглядае тэрыторыю, разам з насельніцамі ходзіць на богаслужэнні, слухае іх спевы і нават назірае за працэсам выпякання просвір — як яшчэ гэта было б магчыма? І так ці інакш, але вядзе размову з Ефрасінняй, бо яе жыццё і сапраўды можа падасца сучаснаму чалавеку шмат у чым дзіўным. Чаму юная Прадслава, унучка Полацкага князя Усяслава і дачка князя Георгія, вырашыла змяніць імя? Чаму прыгажуня, чыёй рукі шукалі многія знаныя князі, абрала шлях манаства? Як яна прыйшла да думкі пабудаваць манастыр у Сяльцы? Якім цудам дамаглася таго, што галоўны храм — Спаса-Праабражэнскі — паўстаў у вызначаны ёй тэрмін? Пра гэты цуд распавядаюць сучасныя насельнікі манастыра: як будаўнікі атрымалі патрэбную для заканчэння прац плінфу. Яе не хапіла, і Ефрасіння маліла Бога, каб дапамог. І ранкам работнікі знайшлі патрэбную колькасць цэглы ў печах, якія вечарам былі пустыя...


Кадр з фільма.

Здзіўляцца не будзе той, каму ўдалося паглыбіцца ў жыццё полацкага манастыра. А людзі з камерай — гэта для насельніц тое яшчэ выпрабаванне, паколькі ў іх свой распарадак. Матушка Іўсіння ад імя настаяцельніцы Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра ігуменні Еўдакіі падзякавала кінамайстрам за працу:

— Вялікім суцяшэннем для нас была згода рэжысёра стварыць традыцыйны дакументальны фільм пра святую, без пастановачных сцэн. Мы ўдзячныя ўдзельнікам здымачнай групы, якія працавалі ў манастыры далікатна і акуратна — так, што мы не выходзілі за рамкі правіл манаскага жыцця. Рэжысёру ўдалося распавесці не толькі пра жыццё і подзвігі прападобнай Ефрасінні, але і прыадкрыць гледачу заслону паўсядзённага жыцця манастыра.

Манашкам, у сваю чаргу, падзякаваў міністр культуры Беларусі Руслан Чарнецкі, які агучваў фільм: за тое, што падтрымалі і былі разам з рэжысёрска-пастановачнай групай. Уладзімір Луцкі, рэжысёр фільма, згадаў, што здымкі пачыналіся вясной мінулага года, калі ў манастыры ішлі будаўнічыя і рэстаўрацыйныя работы, і гэта вельмі ўскладняла працэс. А так хацелася зрабіць прыгожы і вобразны фільм, перадаўшы чароўную атмасферу ўсяго манастыра і Спаса-Праабражэнскага храма, распісанага фрэскамі.

І гэта таксама дзіва, якое стала магчыма дзякуючы Ефрасінні. На адной з фрэсак паўстае яе постаць у поўны рост. На жаль, нам не дадзена ўбачыць яе твар — менавіта гэты фрагмент страчаны (Ефрасіння застаецца для нас таямніцай). Але гэта адзіная выява, дзе ў яе няма німба. Затое ў руках — храм, які яна падносіць Госпаду. На ім у два шэрагі ідуць трохлопасцевыя какошнікі — гэта форма менавіта адсюль стала распаўсюджвацца ў старажытнарускай архітэктуры. Яшчэ адна асаблівасць: Ефрасіння спланавала ў храме келлю справа — для сябе, а злева — для сястры, якая таксама прыняла манаства. У гэтых келлях ёсць акенцы. Калі глядзіш у іх, то з аднаго боку бачыш вялікую фігуру прападобнага Сямёна Стоўпніка, а з другога — прападобнага Данііла Стоўпніка: перад вачыма прыклад подзвігу дзеля Госпада.

У фільме распавядаюць пра тое, як пачыналася рэстаўрацыя гэтага храма — фактычна з раскрыцця жывапісу. Рэстаўратарам удалося адслаіць увесь алейны роспіс больш позняга перыяду, цяпер ён дэманструецца ў музеі. А мы можам бачыць раннія фрэскі, якія адкрыліся, — магчыма, паспрыяла сама прападобная? Яна спачывае ў манастыры, куды вярнулася праз стагоддзі. Срэбра на раку для беларускай святой дапамог здабыць Прэзідэнт краіны. А яна радуецца і працягвае тварыць дабро — манашкі сведчаць пра цуды, якія даюцца тым, хто верыць.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**


**ООО «Деловая оценка»** (организатор аукциона)
по поручению **Речицкого РайПО** (продавец)
извещает о проведении **28 марта 2025 года** открытого аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

**Лот № 1:** капитальное строение,
инв. № 340/С-3202682, площадью 764,4 кв. м, назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 324581602101000179 площадью 0,1931 га по адресу: Гомельская обл., Речицкий р-н, Борщёвский с/с, д. Борщёвка, ул. Советская, 41А. Составные части и принадлежности: две кирпичные пристройки, пристройка из газосиликатных блоков, два склада, два сарая, навес, погреб, ограждение. Лот включает оборудование в количестве 43 ед.
**Начальная цена** продажи без НДС – 105 400,00 бел. руб.
**Задаток** – 1 054,00 бел. руб.

**Лот № 2:** капитальное строение,
инв. № 340/С-3204616, площадью 128,8 кв. м, назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 324584404101000013 площадью 0,0303 га по адресу: Гомельская обл., Речицкий р-н, Защёбьевский с/с, д. Макановичи, ул. Школьная, 101. Составные части и принадлежности: кирпичная пристройка.
**Начальная цена** продажи без НДС – 13 800,00 бел. руб.
**Задаток** – 138,00 бел. руб.

**Лот № 3:** капитальное строение,
инв. № 340/С-3204621, площадью 88,9 кв. м, назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина № 37, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 324585406601000007 площадью 0,0471 га по адресу: Гомельская обл., Речицкий р-н, Короватичский с/с, д. Тишковка, ул. Советская, 6. Составные части и принадлежности: пристройка из блоков газосиликатных.
**Начальная цена** продажи без НДС – 12 500,00 бел. руб.
**Задаток** – 125,00 бел. руб.

**Продавец: Речицкое РайПО**, г. Речица, ул. Привокзальная, д. 2.
Конт. тел.: +375 232 34-98-92, +375 33 643-43-14.
**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

**Для участия в аукционе необходимо:**
**1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB3012132 2650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**
**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.
**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 27.03.2025 г. в 17.00.** Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте **www.deloocenka.by.**
**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в течение **30 (тридцати) календарных дней** с момента проведения торгов. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола.
Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Указанные объекты никому другому не проданы, не заложены, под запретом не состоят, судебного спора о них не имеется, других владельцев нет. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62.**



Центр Промышленной Оценки
• **ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
• **ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, офис. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Белреставрация», г. Минск, пр-т Партизанский, д. 31. УНП 100039768 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, офис. 1 (**www.ipmtorgi.by**) |
| **Предмет электронных торгов** | |
| **Легковой внедорожник хэтчбек GEELY COOLRAY,** р/зн 9847 ТВ-7, 2020 г. в. Месторасположение: г. Минск, ул. Бабушкина, д. 72 | |
| **Начальная цена с НДС – 40 011,84 бел. руб.** (снижена на 20 %) | |
| С подробной информацией по предмету торгов можно ознакомиться на сайте организатора торгов **www.cpo.by**. Шаг аукциона: 5 % от текущей цены | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов:** 100 % от цены продажи предмета торгов оплачиваются в течение **10 рабочих дней** с даты заключения договора купли-продажи | |
| Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **6 %** от цены продажи лотов в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения торгов | |
| Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 04.01.2025 | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 11.03.2025.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 10.03.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by | |
| **Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by** | |



**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**акционеров открытого акционерного общества «Минсктелекомстрой» об отмене внеочередного общего собрания акционеров**

Уважаемые акционеры! Открытое акционерное общество «Минсктелекомстрой» (далее – Общество) (местонахождение: г. Минск, ул. Аннаева, 49/1-1) извещает своих акционеров об отмене внеочередного общего собрания Общества, которое должно было состояться 27 февраля 2025 г. в 16.00 по адресу: Минский р-н, п. Ратомка, ул. Заславская, 8а, актовый зал.
Основание: решение наблюдательного совета Общества от 25 февраля 2025 г. (протокол № 96).
УНП 100068131

ФАЛЬКЛОРНЫЯ СКАРБЫ

# МУДРАСЦЬ НАРОДА, СХАВАНАЯ Ў СЛОВЕ

**Па ініцыятыве старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзіміра Гусакова Цэнтр даследаванняў беларускай культуры мовы і літаратуры распачаў работу, накіраваную на папулярызацыю багатай моўнай спадчыны, сабранай вучонымі. Пазнаёміцца з ёй можна дзякуючы серыі ілюстраваных альбомаў «Фальклорныя скарбы Беларусі». Прэзентацыя трох першых альбомаў прайшла ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы Нацыянальнай акадэміі навук.**

Першы альбом «Адкуль праўда і крыўда» знаёміць з легендамі і былічкамі. Асаблівасць новых фальклорных выданняў у тым, што тут друкуюцца тэксты, сабраныя вучонымі ў розных беларускіх вёсках у апошнія дзесяцігоддзі, некаторыя з іх друкуюцца ўпершыню. Дзякуючы QR-кодам можна нават пачуць легенды ад саміх носьбітаў: паслухаць запісы ці паглядзець відэа. Легенды адлюстроўваюць светапогляд нашых продкаў. Пры дапамозе іх тлумачылася паходжанне сусвету, нябесных цел (нават плям на Месяцы), жывёл, кузурак, раслін, чалавека, народаў. Адрозненне легенд ад казак у тым, што нашы продкі, якія перадавалі гэтыя, здавалася б, казачныя гісторыі праз пакаленні, верылі, што так сапраўды было. Часам у легендах сустракаюцца і незвычайныя міфічныя персанажы. Там можна ўбачыць, як народ «перапрацоўваў» біблейскія сюжэты.

Як расказала адна з укладальнікаў альбома, загадчык сектара этналінгвістыкі і фальклору Інстытута мовазнаўства Алена Боганева, у Шумілінскім раёне дзядуля 1912 года нараджэння расказваў, што, калі Маісей пераводзіў яўрэяў праз Заходнюю Дзвіну, рэчка расступілася, а над перадследнікамі вада сышлася, і тыя ператварыліся ў напаўлюдзей-напаўрыб. Такіх міфічных істот завуць фараонамі. Дарэчы, падобныя легенды распаўсюджаны па ўсёй Еўропе, асабліва ў краінах, якія абмываюцца морамі. Дзіўна, што сюжэт захаваўся і на нашых, немарскіх, землях.

Другі альбом знаёміць з прыказкамі і прымаўкамі. Як расказалі яго ўкладальнікі Вольга Корсак і Зміцер Санько, праца аказалася няпростай, бо прыказак магло б хапіць не менш чым на восем кніг. Для новага выдання яны адбіраліся не проста пад пэўныя раздзелы (чалавек сярод людзей, сям'я, каханне, сяброўства, жыццёвыя назіранні), на кожнай старонцы паказана асобная тэма. Побач з беларускімі прыказкамі змешчаны не пераклады, а менавіта адпаведнікі на рускай і англійскай мовах.







Трэці том прысвечаны замовам. Як заўважыла загадчыца аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Тацццяна Валодзіна, такія тэксты, што таемна перадаваліся ў радзіне ці ад вучня паслядоўнікам, адлюстроўваюць дзівосны шматгранны свет веравання, вобразаў, эмоцый, слоў і гукаў, і за кожным з іх — вера ў сілу слова.

Яшчэ адна адметная рыса серыі — афармленне альбомаў. Яго рабілі майстры выцінанкі з розных рэгіёнаў Беларусі.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**






Фота Ірыны ТАМКОВІЧ.




# СКАНВОРД

## ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

**Па гарызанталі:** Бярозавік. Вакзал. Вобад. Сыта. Жук. Джыцу. Одум. Талака. Крах. Карась. Пчала. Баланс. Адам. Дата. Жаваранак. **Па вертыкалі:** Знак. Воз. Колба. Завод. Брыгада. Джут. Скол. Трук. Дама. Мазь. Ака. Капкан. Кабура. Саната. Лада. Адан. Смак.

**Склаў Юрый ФАЛІНСКІ,**
*г. Мінск.*

## 26 ЛЮТАГА Даты Падзеі Людзі




**1805** год — нарадзіўся (в. Бяльковічы, цяпер у Пухавіцкім раёне) Аляксандр Здановіч, беларускі гісторык, пісьменнік, педагог, кандыдат філасофіі. Скончыў Віленскі ўніверсітэт. Аўтар дапаможнікаў «Нарыс усеагульнай гісторыі для дзяцей», «Храналагічна-гістарычны нарыс сучасных дзяржаў ад V стагоддзя да нашых дзён» і інш. Член Віленскай археалагічнай камісіі.

**1912** год — нарадзіўся Уладзімір Карпаў, беларускі пісьменнік. Аўтар раманаў «За годам год», «Вясновыя ліўні», «Нямігі крывавыя берагі» і інш. Укладальнік і адзін з аўтараў кнігі «Мы раскажам пра Мінск».

**1932** год — у Мінску выйшаў першы нумар літаратурна-мастацкай газеты «Літаратура і мастацтва».




**1815** год — Напалеон Банапарт, які быў высланы на Эльбу, збег з вострава. Пагрузіўшы на караблі 1 тысячу салдат, ён аддаў загад узяць курс да французскіх берагоў. 1 сакавіка Напалеон высадзіўся ў заліве Жуан недалёка ад Кан і са сваёй невялічкай арміяй накіраваўся ў Парыж па дарозе праз Грэнобль. Палітычнае становішча імператару спрыяла. Пасля падзення напалеонаўскай Францыі і рэстаўрацыі Бурбонаў дзяржавы-пераможцы паспелі пасварыцца, іх кааліцыя распалася. Авантура Напалеона ўдалася.

**1910** год — нарадзіўся Сяргей Георгіевіч Гаршкоў, адмірал Флоту Савецкага Саюза, двойчы Герой Сацыялістычнай Працы. Пад яго кіраўніцтвам праходзіла распрацоўка праграм і планаў развіцця флоту пачынаючы з 1956 г. Унёс буйны фундуш у тэорыю і практыку стварэння сучаснага акіянскага ракетна-ядзернага Флоту СССР. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

**1917** год — беспарадкі ў Петраградзе. Дзяржаўная Дума распушчана. У горадзе з'яўляюцца барыкады. Пачынаецца ўсеагульная стачка і пераход войск на бок рэвалюцыі.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11 384. Індэкс 63850. Зак. № 431.

Нумар падпісаны ў 19.30 25 лютага 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12